Шпіёны, шкоднікі, падпальшчыкі ваины перад пралетарскім судом

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (б) Беларусі.

Год выдаўня—XIV
№ 276 (3374)
СЕРАДА, 26 лістапада 1930 г.

Цана нумару 5 кап.
Выходзіць штодзенна за выключэннем суботы

Москва, В-ко ЦКК СССР
Инт. служ. сыск.

Справе абароны--усе 36 дэкад!

«Дэкада абароны», якая толькі што праведзена па ўсім Савецкім Саюзе, супала з моментам набываньня абаронаю ваеннай небяспекі, узмацненьня спроб інтэрвэнтаў дэзарганізаваць наша сацыялістычнае будаўніцтва з сярэдзіны, пры дапамозе сваіх наймітаў - шкоднікаў.

Матар'ялы, апублікаваныя за апошні час у сувязі з выкрыцьцём контр - рэвалюцыйнай «прамысловай партыі», прэліваюць яскравае сьвятло на імпэрыялістычныя пляны задушэньня краіны пралетарскай дыктатуры. Шпіянаж, шкодніцтва, эканамічная блёкада, простая падрыхтоўка да ваеннай інтэрвэнцыі — вось арсэнал зброі, ужываны супроць савецкай краіны драпежнікамі капіталістычнага сьвету, што разьдзіраецца ўсё ўзрастаючымі ўнутранымі і вонкавымі супярэчнасьцямі.

Пралетарыят і працоўныя масы БССР, разам з усім Савецкім Саюзам, адказалі інтэрвэнтам дэманстрацыяй сваёй цьвердай волі да міру, дэманстрацыяй сваёй гатоўнасьці абараняць да апошняй кроплі крыві сацыялістычную бацькаўшчыну пралетарыяту ўсяго сьвету, умацоўваць яе абарону, упарта і націхільна весьці гаспадарчае і культурнае будаўніцтва.

«ДЭКАДА АБАРОНЫ» ЗЬЯВІЛАСЯ ЯСКРАВАЙ ФОРМАЙ БАЯВОГА АДЗІНСТВА ПРАЦОЎНЫХ МАС. ЯНА ПЕРАТВАРЫЛАСЯ У ШЫРЭЗАШУЮ МАСАВУЮ ПАЛІТЫЧНУЮ КАМПАНІЮ УМАЦАВАНЬНЯ АБАРОНАЗДОЛЬНАСЬЦІ КРАІНЫ, ЯНА ВЫЛІЛАСЯ У МАГУТНУЮ ДЭМАНСТРАЦЫЮ ПРАЦОЎНЫХ МАС АДДАНАСЬЦІ ГЕНЭРАЛЬНАЙ ЛІНІІ ПАРТЫІ, ГАТОЎНАСЬЦІ ПАД ЯЕ БАЯВЫМІ СЬЦЯГАМІ БУДАВАЦЬ САЦЫЯЛІЗМ І САМААДДАНА АБАРАНЯЦЬ КАСТРЫЧНІЦКІЯ ЗАВАЯВАНЬНІ.

«Дэкада абароны» выклікала новую хвалю працоўнага энтузіязму рабочае класы і бядняцка - наргасных мас, узьняла іх класавую пільнасьць, яшчэ больш мабілізавала іх увагу вакол задач абароны краіны. У гэтым — вялікае палітычнае значэньне «дэкады» перш за ўсё.

Цяжка пералічыць усе віды і формы пралуценьня працоўнымі масамі свайго удзелу ў справе умацаваньня гаспадарчай і ваеннай магутнасьці краіны. Настолькі гэтыя формы многагранныя і разнастайныя.

За час дзесяцідзеньніка абароны па БССР арганізаваліся шматлікія новыя ударныя брыгады імя «Дэкады абароны» і Асоавіяхіму. Уздымае сацпаборніцтва і ўдарніцтва, накіраванага на змаганьне за выкананьне гаспадарчых праграм асобнага кварталу, рабочая клясе правяла свой практычны ўдзел па ўмацаваньні матар'яльнай базы абароны сацыялістычнага будаўніцтва. «Дэкада абароны» зьявілася адначасова дэкадай змаганьня за прамфінплян, дэкадай ліквідацыі прарыву на прадпрыемствах.

Інтэрвэнтам і шкоднікам рабочая клясе БССР адказала ўмацаваньнем СУВЯЗІ СА СВАЁЙ ГЭРАІЧНАЙ ЧЫРВОНАЙ АРМІЯЙ — вернай узброенай апорай пралетарскае дзяржавы. Паляпшэньне работы па шэфстве фабрык і заводаў над чырвонай казармай, умацаваньне сувязі чырвонаармейскіх часьцей з саўгасамі і калгасамі зьявілася вялікым праяўленьнем баявога адзінства працоўных мас, лепшай зарукай нашай баяздольнасьці.

У часе «дэкады» перад тварам узмацненьня напасьніка, ваеннай небяспекі, ПРАЛЕТАРЫЯТ ДАВЕЎ СВАЮ ПАДРАЗНАЯ АДДАНАСЬЦЬ БАЛЬШАВІЦКАЙ ПАРТЫІ ШМАТЛІКІМ УСТУПЛЕНЬНЕМ У ЯЕ РАДЫ ЛЕПШЫХ З ЛЕПШЫХ ПЕРАДАВІКОЎ - УДАРНІКАЎ, КАРЭННЫХ КАДРАВІКОЎ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ, СТАРОЙ ПРАЛЕТАРСКАЙ ГВАРДЫІ.

Вялікім уздымам адзначана «дэкада абароны» і ў нашай вёсцы. ЗГУРТАВАНЬНЕМ ВАКОЛ БЯГУЧЫХ ЛЁЗУНГАЎ КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ, УМАЦАВАНЬНЕМ ІСНУЮЧЫХ І СТВАРЭНЬНЕМ НОВЫХ КАЛГАСАЎ, ЧЫРВОНЫМІ АБОЗАМІ, ДАТЭРМІНОВЫМ ВЫКАНАНЬНЕМ ЗАГАТОВАК, РАЗЬЦЬЦЕМ САЦСПАБОРНІЦТВА У КАЛГАСНЫМ І САЎГАСНЫМ БУДАЎНІЦТВЕ, АДЛІЧЭНЬНЕМ У ФОНД АБАРОНЫ — ВОСЬ ЧЫМ АДЗНАЧЫЛІ «ДЭКАДУ» РАБОЧЫЯ САЎГАСАЎ, КАЛГАСЬНІКІ І БЯДНЯЦКА - СЕРАДНЯЦКІЯ МАСЫ ВЕСКІ.

«Дэкада абароны» прайшла пад знакам УМАЦАВАНЬНЯ І РОСТУ ШМАТМІЛЬЕННАЙ АРГАНІЗАЦЫІ ПРАЛЕТАРСКАЙ АБАРОНЫ — АСОАВІЯХІМУ. За час «дэкады» беларуская арганізацыя Асоавіяхіму папоўніла свае рады новымі магутнымі атрадамі працоўных мас. Мы маем шмат выпадкаў стварэньня цэлых новых ячэек. У радзе месц колькасны склад Асоавіяхіму падвоіўся. Шмат янія фабрыкі, заводы і калгасы пагалоўна уступілі ў члены Асоавіяхіму. «Дэкада абароны» ўнесла значнае ажыўленьне ў работу практычных арганізацый Асоавіяхіму і павялічыла іх колькасьць (страпковыя, хэмічныя, вайсковыя гурткі і г. д.). Вялікая работа праведзена Асоавіяхімам у часе «дэкады» па лініі камплектаваньня авіяшкол. У вачох усёй пралетарскай грамадзкасьці яшчэ больш узьняўся аўтарытэт арганізацыі Асоавіяхіму, павысілася зацікаўленасьць вайсковай вучобай.

Працоўныя масы Савецкай Беларусі, паказаўшы яскравыя ўзоры працоўнага гэраізму, адначасова адзначылі «дэкаду» ўзмацненьнем фінансавых рэсурсаў абароны. Патокі адлічэньняў, суботнікі, адпрацоўкі, «гадзіны абароны», дадатковая падпіска на пазыку «Пяцігодка—за чатыры гады» — усё гэта пашырыла фонд абароны па адкрыт БССР на сотні і сотні тысяч рублёў. Беларускім таварыствам Асоавіяхіму у часе «дэкады» перададзены Чырвонай армі яшчэ адзін самалёт імя ЦК КП(б)Б.

«ДЭКАДА АБАРОНЫ» ДАЛА ВЯЛІКІ ЎКЛАД У СПРАВУ ЎЗМАЦНЕНЬНЯ БАЯГАТОЎНАСЬЦІ КРАІНЫ.

Адначасова «дэкада» выкрыла і слабыя бакі нашай работы. «ДЭКАДА» ПАКАЗАЛА, ШТО ПЫТАНЬНІ АБАРОНЫ ЯШЧЭ НЕ ЗАНЯЛІ СВАЙГО МЕСЦА ВА ЎСЁЙ СЫСТЭМЕ НАШАГА БУДАЎНІЦТВА, ІМІ МЫ ЗАЙМАЕМСЯ АД ВЫПАДКУ ДА ВЫПАДКУ, ПА-КАМПАНЕЙСКУ, А НЕ СЫСТЭМАТЫЧНА.

Трэба з усёй рашучасьцю паказаць, што БОЛЬШАСЬЦЬ ПАРТАРГАНІЗАЦЫЙ ЯШЧЭ НЕ ЗРАБІЛА ПРАКТЫЧНЫХ ВЫВАДАЎ З ТАГО, ШТО САЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ БУДАЎНІЦТВА І ЯГО АБАРОНА ЗУСІМ НЕАДЛУЧНЫ, што пытаньні ўмацаваньня матар'яльнай базы абароны, узмацненьня баявой моцы Чырвонай арміі, ВАЯНІЗАЦЫІ ПРАЦОЎНАГА НАСЕЛЬНІЦТВА — важнейшая, кардынальная задача усёй КП(б)Б, усёй рабочай клясы і ўсіх яе арганізацый.

Апартуністычная недаацэнка значэньня пралетарскай абароны на жаль упасьціла яшчэ вельмі многім нашым партыйным і камсамольскім арганізацыям. У некаторых мясцох «дэкада абароны» была палітычна змазана, а сям-там яе яшчэ і зусім не праводзілі, пад прадлогам налучанасьці «больш важных с.-г. кампаній». Наўменьшы ўвазе «дэкаду абароны» з выкананьнем бягучых гаспедарча - палітычных кампаній, а часамі і простае іх процістаўленьне, мелі не адзінкавае месца. У Смалявіцкім раёне справа дайшла да таго, што сакратар РК КП(б)Б самаўласна перакінуў тэрміны «дэкады» і кіраўнічых раённых работнікаў Асоавіяхіму накіраваў на збожжазагатоўкі. Наколькі шкодныя такія адносіны да справы абароны гаварыць ня трэба.

«Дэкада» з усёй відавочнасьцю паказала, што многія парт'ячэйкі яшчэ не павярнуліся тварам да пытаньняў абароны, ня кіруюць пасапраўднаму гэтай справай, зусім ня цікавяцца работай ячэек Асоавіяхіму.

ВАЙСКОВАЯ РАБОТА СЯРОД КАМСАМОЛУ АМАЛЬ ЗУСІМ АДСУТНІЧАЕ. Удзел камсамолу ў арганізацыях Асоавіяхіму зусім невыстарчальны. У БАКУ АД ВАЙСКОВАЙ РАБОТЫ ВЕЛЬМІ ЧАСТА СТАЯЦЬ І НАШЫ ПРАФЭСЫЯНАЛЬНЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ.

Недаацэнка вайсковай работы з боку партыйных, камсамольскіх і прафэсыянальных арганізацый зьяўляецца вясноўнай прычынай СЛАБОЙ РАБОТЫ НІЗАВОЙ СЕТКІ АСОАВІЯХІМУ І ЯГО РАЁННЫХ ЦЭНТРАЎ. З другога боку, і жывое кіраўніцтва раёнамі з боку ЦС Асоавіяхіму яшчэ як трэба не нападжана.

У пытаньнях абароны сацыялістычнага будаўніцтва трэба неадкладна дабіцца карэннага пералому і ПЕРШ ЗА ЎСЁ З БОКУ РАЁННЫХ КАМІТЭТАЎ І ПАРТАРГАНІЗАЦЫЙ. Ваянізацыю працоўных мас трэба зрабіць першачарговай, неадлучнай арганічнай часткай нашай штодзённай работы.

НЕДААЦЭНКА ВАЙСКОВАЙ РАБОТЫ НЯ МОЖА РАЗГЛЯДАЦЦА ІНАКШ, ЯК ГОРШАЕ ПРАЯЎЛЕНЬНЕ ПРАВАГА АПАРТУНІЗМУ НА ПРАКТЫЦЫ, БО ГЭТА НЕДААЦЭНКА ДЭМАБІЛІЗУЕ МАСЫ Ў ЗМАГАНЬНІ З УСЁ СТРАШНАЙ РАЕННАЙ НЕБЯСЬПЕКАЙ, ПРЫТУПЛЯЕ ІХ КЛЯСАВУЮ І ЗНАЧЭНЬНЕ, ПАСЛАБЛЯЕ БАЯВУЮ МАГУТНАСЬЦЬ ПРАЛЕТАРСКАЕ ДЗЯРЖАВЫ І, ТАКІМ ЧЫНАМ, АБ'ЕКТЫЎНА ІГРАЕ НА РУКУ КЛЯСАВАМУ ВОРАГУ, ПАДАГРАВАЕ ІНТЭРВЭНЦЫЯНІСЦКІЯ АПЭТЫТЫ СУСЬВЕТНАГА ІМПЭРЫЯЛІЗМУ.

Цэнтр увагі ў вайсковай рабоце павінен быць скансэнтраваны на УМАЦАВАНЬНІ АСОАВІЯХІМУ — гэтай асноўнай абаронкай арганізацыі пралетарскай грамадзкасьці. Работу кожнай ячэйкі, райсавету Асоавіяхіму трэба забясьпечыць штодзённым цьвёрдым ПАРТЫЙНЫМ КІРАЎНІЦТВАМ, ДАЕЛАВОЙ КАНКРЭТНАЙ ДАПАМОГАЙ. Надыходзячыя выбары ў кіраўнічыя органы Асоавіяхіму павінны зрабіцца масавым аглядам нашае баявое гатоўнасьці, узьняць работу Асоавіяхіму на вышэйшую ступень, замацаваць посьпехі, дасягнутыя ў часе «дэкады», яшчэ больш мабілізаваць працоўныя масы на ўмацаваньне пралетарскай абароны, яшчэ больш згуртаваць іх вакол генэральнай лініі партыі.

Мы павінны заўсёды памятаць, што падрыхтоўка вайны супроць СССР зайшла так далёка, што, як паказвае абвінаваўчае заключэньне па справе «прампартыі», сусьветным імпэрыялізмам ужо былі даведаны вызначаныя тэрміны інтэрвэнцыі, расстаўлены сілы, разьмеркаваны эдрадніцкія роді. Пачаты ўчора працэс па справе «прампартыі» зьявіцца працэсам ня толькі над агентамі замежнага капіталу ўнутры Савецкага Саюзу, але і будзе абвінаваўчым працэсам сусьветкага імпэрыялізму ў падрыхтоўцы ім інтэрвэнцыі супроць СССР. Гэта абавязвае нас заўсёды быць на варце, гатовымі кожную хвіліну стаць на абарону сацыялістычнага будаўніцтва. У першую чаргу гэта палажэньне адносіцца да БССР, як да фарпосту Савецкага Саюзу на мяжы двух сьветаў.

Будуючы, пад кіраўніцтвам бальшавіцкай партыі ў жорсткай барацьбе супроць правых і «левых» апартуністых, сацыялізм, рабочая клясе і працоўныя масы БССР будуць пільна сачыць за мануўрамі сусьветнага фашызму, будуць усямерна умацоўваць абарону пралетарскае дзяржавы, будуць рашуча біць на апартуністычнай недаацэнцы значэньня пытаньня абароны і— небясьпекі ваеннага нападу капіталістых на краіну пралетарскай дыктатуры.

«ДЭКАДА» СКОНЧЫЛАСЯ. СПРАВЕ АБАРОНЫ—УСЕ ТРЫЦЦАЦЬ ШЭСЬЦЬ ДЭКАД У ГОД!

Слабы тэмп ільназагатовак--паслуга шкоднікам і інтэрвэнтам

Ні аднаго дня адтэрмінаваньня кулаку ў выкананьні цьвёрдых заданьняў

Тэлеграма ЦК КП(б)Б і СНК БССР

Усім райкомам КП(б)Б, райвыканкомам, упаўнаважаным СНК

Зварачаем увагу на выключна слабую работу па загатоўцы ільну і першую дэкаду лістапада сарваны. Прапануем:

1) Безадкладна дабіцца пералому ў загатоўках, праверыць работу загатоўчых арганізацый, мабілізаваць грамадзкасьць, актывізаваць дзейнасьць камісій садзейнасьці.

2) Устанавіць прэміяваньне здатчыкаў ільну і канапель адпаведна пастанове ЭКАНА ад 8 верасьня. Да прэміяваньня прыступіць зараз-жа з наяўных фондаў.

3) Забясьпечыць апрацоўку ільну і канапель у саўгасах і калгасах і паведзьці растлумачальную работу сярод бяднацка-серадняцкіх гаспадарак аб паскарэньні апрацоўкі і здачы ільну і канапель.

4) Безадкладна праверыць цьвёрдыя заданьні кулацка-заможным гаспадаркам, устанавіўшы канчатковы тэрмін здачы ільну і канапель гэтымі гаспадаркамі 10 сьнежня.

5) Выразна захоўваць пяцідзённую справаздачнасьць.

6) Райкомам, райвыканкомам, упаўнаважаным СНК неадкладна пераключыць усю работу такім чынам, каб загатоўкі ільну і канапель, а таксама семя ільну і канапель праводзіць, як важнейшае заданьне нараўні са скансэньнем загатоўні і вывазкі гароднины і бульбы і скансэньнем збожжазагатовак.

ЦК КП(б)Б ГЕЙ.
СНК БССР ГАЛАДЗЕД.

У Дрысе, Лёзьне, Боркавічах
ГЛЫБОКІЯ ПРАРЫВЫ

Боркавіцкі, Дрысенскі і Лёзьненскі раёны—асноўныя ільнаводныя раёны БССР. Зусім відавочна, што мясцовыя арганізацыі павінны былі нагадаць узор сапраўды бальшавіцкіх тэмпаў у выкананьні плану загатовак ільну, валакна і ільнянога семя.

Стаўка на самацёк, безадказнасьць, фармальныя адносіны да давядзеных плянаў да мясц, да дачы цьвёрдых заданьняў кулацка-заможнаму двару, адсутнасьць увагі і кантролю паступленьняў ад кулацка-заможных гаспадарак, слабая арганізацыйна-масавая работа,— вось што характарызуе работу мясцовых арганізацый, галоўным чынам, Боркавіцкага і Дрысенскага раёнаў. Вось факты.

На Боркавіцкім раёне 26,3 проц. ільна яшчэ на вымачэнні і не пасьлана. У калгасе «Новая культура» лён з 5 гектараў пачалову агнію. 1½ га пагаслі конямі і таксама згнілі. У калгасе «Новы шлях», калгасах імя «Варанцлава» і «Кастрычнік» лён це абмалочаны, стаіць у стагох на полі.

У самым буйным ільнаводным саўгасе Боркавічы лён з 437 га ляжыць не абмалочаным.

Плян загатовак ільнянога семя выкананы на раёне на 22,6 проц.

Кулакі выкарыстоўваюць бязьдзейнасьць сельсаветаў і ігнаруюць здачу вызначанай ім колькасьці ільнянога валакна і семя.

При азнаямленьні з сапраўдным становішчам выявілася, што ў Боркавіцкім райпалгассаюзе два гады іржавеюць на складах 20 шт. трохрадовых ільнамялак. Ніхто не пакланаціўся адрамантаваць мялкі і даць калгасам, якія адчуваюць у іх патрэбу.

2 трактарныя 12-радовыя ільнамялкі усё лета ляжалі на складах райкалгасаюзу бяз руху. Толькі за апошнія часы іх пачалі устанаўліваць. Калі-б раней устанавілі машыны, можна было-б да гэтага часу памяць шмат ільну.

Раённыя работнікі цешаць слабе тым, што будуецца Боркавіцкі ільнапрацоўчы завод, які ўвесь лён апрацуе. Між тым, скансэньне Боркавіцкага заводу з-за агідных адносін будаўнічых арганізацый затрымліваецца.

Нізкай работы сярод калгасьнікаў за паскарэньне тэмпаў перапрацоўкі ільну не выдасьцца, што можа выклікаць пасьпаўленьне часткі ільну.

Аб «тэмпах» загатовак у Дрысенскім раёне гаворыць той факт, што загатоўлена на раёне загатоўлена ўсяго... 885 клтр. валакна. Некаторыя раённыя работнікі тут адзначыліся таксама клапатлівасьцю аб кулаку, паказаўшы яскравы прыклад правай практыкі. У той час, як у Дрысенскім раёне, паводле статыстычных даных, ураджай ільнянай саломы ў сярэднім дае паўтары тоны з га, работнік РВК Пятровіч пры вызначэньні цьвёрдых заданьняў кулацкім гаспадаркам зьменшыў гэтую лічбу да 1,1 тоны з га.

Перашкаджаюць апрацоўка ільну ў калгасах Дрысеншчыны таксама праходзіць недапушчальна марудна. У калгасе «Камінтэрн» 10 проц. ільнянай саломы гніе ў кулёх. Такое-ж становішча з ільнянага валакна выкананы ўсяго на 3 проц.

Гад сельсаветаў патурае кулаку. Так, Сутоцкі, Добрамыскі, Горбаўскі сельсаветы не прынялі канкрэтных мер, каб прымусіць кулака выканаць у тэрмін, вызначаны яму цьвёрдым заданьні па ільну-валакну.

Партарганізацыі гэтых раёнаў павінны неадкладна павярнуцца тварам да ільназагатовак. Трэба прымусіць кулака поўнасьцю і ў тэрмін выканаць даныя яму цьвёрдыя заданьні, трэба рашуча ўдарыць па правааапартуністычнай практыцы і прымірэнцтву да кулака. Трэба мабілізаваць масы калгасьнікаў і адзінаасобнікаў-беднякоў і сераднякоў на выкананьне баявога загаду.

Яз. Сьнежны

Грозная лавіна гневу і абурэньня

30.000 пралетараў Менску ўчора дэманстравалі супроць арганізатараў інтэрвэнцыі, за пяцігодку

А 4 гадзіне дня першыя атрады Чырвонай арміі зьявіліся на Пляцы Волі. Яны прышлі адказваць падпальшчыкам вайны, імпэрыялістычным драпежнікам, што Чырвоная армія — на варце сацыялістычнага будаўніцтва. Яны прышлі без стрэльбаў, куляметаў і гармат, дэманструючы гэтым свае націхільнае імкненьне да міру. Але, імкнучыся да міру, Чырвоная Армія заўсёды гатова да адпору.

— «Чырвоная армія на пройсці інтэрвэнтаў адказвае узмацненьнем баявой падрыхтоўкі, узмацненьнем рэвалюцыйнай пільнасьці».

— «Чырвоная армія патрабуе вышэйшай меры пакараньня шкоднікам контр - рэвалюцыянэрам».

Адзін за другім праходзяць атрады войск менскага гарнізону.

— «Імпэрыялістычным драпежнікам і белабандытам не ажыцьцявіць сваіх крывавых плянаў. Мы — на варце!».

— «Прач з дарогі малавераў, правых і «левых» апартуністых, якія тармозяць сацыялістычнае наступленьне» — крычаць шматлікія лёзунгі і плякаты.

АБВШ, Ж-скі страпковы полк, кавалерыя, артылерыстыя, куляметчыкі, атрады сувязі. Гучным «ура» адказваюць чырвоныя байцы на прывітаньні прадстаўнікоў партыі і ўраду, якія знаходзяцца на трыбуне.

Кончылася дэманстрацыя войск. На пляц уступаюць новыя калёны дэманстрантаў — першыя калёны працоўных г. Менску.

Чыгунка, завод «Энергія», «Бальшавік», «Кастрычнік», «Камунар», будаўнікі, харчавікі, савецкія служачыя, студэнцтва, вучнёўства і моладзь.

Рабочыя непасрэдна пасьля работы прышлі дэманстраваць свае абурэньне вынікамі шкоднікаў, свае імкненьне да канчатковай перамогі справы сацыялістычнага будаўніцтва.

У ІХ—АЛЬТАН ТЭЙ ВЯЛІЗНАЙ ХВАЛІ ГНЕВУ, ХВАЛІ АБУРЭНЬНЯ, ЯКАЯ АХАПІЛА МІЛЬЁННЫЯ МАСЫ ПРАЦОЎНЫХ УСЯГО САВЕЦКАГА САЮЗУ.

— «Адкавіць шкоднікам у пашпарце на жыцьцё».

— «Да вышэйшай меры пакараньня хапетаў Нобеля».

— «Сьмерць наймітам капіталу».

У іх—пралетарскі адказ на спробы інтэрвэнтаў узарваць Савецкі Саюз.

— «У адказ на падрыўную работу інтэрвэнтаў — узмацнім абароназдольнасьць СССР».

— «Пралетарская падзяка АДПУ. Ордэн Леніна вернаму вартаўніку рэвалюцыі».

У ГЭТЫХ ЛЁЗУНГАХ — ПАЛКАЕ ІМКНЕНЬНЕ ПРАЛЕТАРЫЯТУ ДА МІРНАГА САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА БУДАЎНІЦТВА, АЛЕ ТАКСАМА І РАШУЧАЯ ГАТОЎНАСЬЦЬ ДА АБАРОНЫ ЗАВАЯВАНЬНЯЎ КАСТРЫЧНІКА.

— «Карты Пуанкарэ будуць біты! Драпежнікі абломяць зубы!».

— «Непарушная сьцяной на абарону краіны саветаў!»

— «На спробы імпэрыялістых адкажам перавыкананьнем прамфінплану!»

У ЛЁЗУНГАХ І ПЛЯКАТАХ — АДНОСІНЫ ПРАЛЕТАРЫЯТУ ДА ПРАВА - АПАРТУНІСТЫЧНЫХ ДВУРУШНІКАЎ, ПАТРАБАВАНЬНІ БЯЗЛІТАСНАЙ БАРАЦЬБЫ З УСІМІ, ХТО УХІЛЯЕЦЦА АД ГЕНЭРАЛЬНАЙ ЛІНІІ ПАРТЫІ:

— «Вон з нашых радоў апартуністы—агенты кулацтва, агенты шкоднікаў».

— «Лепшых ударнікаў у партыю Леніна».

— «Цяперь згуртуемся вакол ленінскага ЦК і яго правадыра тав. Сталіна».

Дзьво гадзіны працягвалася дэманстрацыя. Дзьве гадзіны кацілася грозная лавіна гневу і абурэньня працоўных сталіцы БССР—Менску.

Звыш 30.000 чалавек прайшло міма трыбуны.

Пралетары Савецкай Беларусі—аванпосты Саюзу Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік—на варце савецкіх межаў, на варце мірнай працы па сацыялістычным будаўніцтве.

Б. У.

АДПУ—ордэн Леніна

Пасьлядні сацыялістычнага будаўніцтва Савецкага Саюзу вызначаюць звышную пільнасьць вораг ў рабочае клясы як за межамі, так і ўнутры СССР.

Нікчэмныя рэшткі капіталістычных эксплятатар сярод інжынэрна-тэхнічных работнікаў, у цесным сувязі з генэральнымі штабамі імпэрыялістых і выкінутымі рэвалюцыяй з СССР капіталістымі, дарэмна імкнуцца затрымаць перамоцнае будаўніцтва сацыялізму ў СССР, разбурыць прамысловае будаўніцтва і транспарт і тым самым падрыхтаваць глебу ўнутры СССР для міжнародных інтэрвэнтаў.

1-шы ўсебеларускі зьезд саюзу пераадрэсаванрацоўных рабочых вітае вернага вартаўніка Кастрычніка — АДПУ і патрабуе ўзнагародзіць ордэнам Леніна.

Акрамя гэтага, рэвалюцыі пратэсту паступілі яшчэ ад агульнага сходу членаў ІТС фабрыкі «Гэрой Працы», будаўнічых арганізацый: Энэргабуду, ВЭА, Трансбуду і брыгады пісьменьнікаў Менску, ад слухачоў 6-ці месячных курсаў прафруху, ад рабочых зав. «Зьвязда», ад студэнтаў, выкладчыкаў, прафэсуры і тэхнічнага пэрсаналу Магілеўскага педтэхнікуму разам з адмагадовымі і двухгадовымі падкурсамі, ад агульнага сходу рабочых Белдзяржбуду, ад служачых Белкавапсаюзу, ад агульнага сходу друкарні «Зьвязды», ад Менскай навуковай асацыяцыі дактароў.

Прыцёк рэзалюцый у рэдакцыю пасьпяшаецца.

Магутная дэманстрацыя пратэсту ў Бабруйску

БАБРУЙСК. (Па тэлефону ад нашага кар.). У сувязі з пачаткам суда над контр-рэвалюцыйнай арганізацыяй, сёньня пасьля працы адбылася магутная дэманстрацыя рабочых і чырвонаармейцаў Бабруйску. У прынятых рэзалюцыях працоўныя патрабуюць самага бязлітаснага пакараньня шкоднікаў-контр-рэвалюцыянэраў.

У адказ на падрыхтоўкі інтэрвэнцыі супроць СССР рабочыя і чырвонаармейцы абяцаюць яшчэ мацней згуртавацца вакол камуністычнае партыі, выкананць і перавыкананць прамфінплян, ня ўхільна ўмацаваць абароназдольнасьць краіны.

На шкодніцтва адказваюць чырвонымі абозамі

Падрыхтоўка імпэрыялістымі інтэрвэнцыі супроць СССР узварушыла і бядняцка-серадняцкія сялянскія масы як калгасьнікаў, так і адзінаасобнікаў і выклікала новы прыплыў у калгасы. Так, сяляне в. Залесьсе, Лаўжанскага сельсавету, Сіроцінскага раёну, арганізавалі калгас з 12 гаспадарак, пад назвай «Краіна Саветаў».

Адначасова сяляне арганізавалі чырвоны абоз бульбы.

Сяляне - калгасьнікі с.-г. арцелі «Чырвоная Лоўжа», Сіроцінскага раёну, у адказ інтэрвэнтам здалі дзяржаве 1.000 пудоў бульбы звыш пляну з абагупенага фонду і з асабістых засеваў—400 пудоў бульбы, 12 пудоў цыбулі, аднаго быка, аднаго кабана, адну авечку і птушак.

Сяляне в. Лешні, Сярмалаўскага сельсавету, Пятрыкоўскага раёну, арганізавалі калгас з 19 гаспадарак імя «Дэкады абароны СССР». Вясной 1931 г. пастанавілі засеяць гэктар у фонд абароны СССР.

Працоўныя сяляне гэтай вёскі пастанавілі на 100 проц. выканаць усе загатоўкі, а асабліва лёсу.

Брыгада ЦК УсеКП(б) на чале з тав. Бубновым у Менску

24 лістапада ў Менск прыехала брыгада ЦК УсеКП(б) у складзе т. БУБНОВА (Наркамасьветы РСФСР) і АДЗІНЦОВА для азнаямленьня з ходам ільназагатовак і высьвятленьня пэрспэктыў разьвіцьця ільнаводзтва па БССР.

Пасьля нарады аб ільназагатоўках, якая адбылася пры ЦК КП(б)Б, т. т. Бубноў і Адзінцоў выехалі ў ільнаводныя раёны.

Тав. Бубноў мяркуе пасьля прыезду з рабоў азнаёміцца з культурным будаўніцтвам БССР.

Максымальна скарыстаць адлігу

На гледзячы на адлігу, адгрузка бульбы і гароднины значна паменшылася, у параўнаньні з папярэднімі днямі, што зьяўляецца недапушчальным. Прапаную максымальна скарыстаць наступную адлігу і ні ў якім разе не паспабляць тэмпаў загатовак і адгрузкі бульбы, асабліва гароднины, да поўнага выкананьня плянаў вывазу.

Старшыня СНК ГАЛАДЗЕД.

Інтэрвэнтам на спыніць сацбудаўніцтва

Супрацоўнікі Лупалаўскага Сельгаскрэдытнага т-ва, у адказ на шкодніцтва і падрыхтоўку інтэрвэнцыі супроць СССР, замацоўваюць сябе ў с.-г. кредытнай сыстэме да канца пяцігодкі.

Супрацоўнікі выклікаюць на сацпаборніцтва па мабілізацыі сродкаў Магілеўскае, Чэрыкаўскае і Менскае кредытныя т-вы.

* *

Рабочыя Дзяржпуразводу імя тав. Сталіна ў Магілеве дамагаюцца ад пралетарскага суда расстрэлу для ўсіх шкоднікаў.

Адначасова рабочыя хадайнічаюць перад урадам аб узнагародзе АДПУ ордэнам Леніна.

Для ўзмацненьня фінансавага становішча краю, рабочыя разгортваюць дадатковую падпіску на пазыку «Пяцігодка—за чатыры гады». Адразу-ж у часе мітынгу была абрана ўдарная тройка для правядзеньня гэтай работы.

Не пасьпеў скончыцца яшчэ мітынг, як з усіх бакоў пасыпаліся заявы аб дадатковай падпісцы. За некалькі хвілін 229 чалавек падпісаліся дадаткова на пазыку на суму 5.720 руб. Запіс працягваецца.

— Нішкая сіла ў сьвеце ня ў стане спыніць гэтую работу на пабудове сацыялізму ў нашым краі—заяўляюць рабочыя.

МАКСІМ ГОРКІ

„Рабочыя і сяляне ўсяго сьвету павінны вызваліць сябе ад улады капіталу"

Адозва т. Горкага да рабочых і сялян

У Маскве Вярхоўны суд рабочых і сялян Саюзу Сацыялістычных Савецкіх распублік судзіць людзей, якія арганізавалі контр-рэвалюцыйную змову супроць рабоча-сялянскай улады.

Пралетары ўсіх краін, асабліва вы, рабочыя Францыі і Англіі, павінны зразумець сэнс гэтай змовы і яе значэньне, бо і вам прыдзецца мець справу з такімі-ж здраднікамі, якіх судзяць у Маскве. Гэтыя людзі—спэцыялістыя па тэхніцы, вучоныя,—лёкаі капіталістых, выгнаных з Расіі, злоўлены з палічным і прызналіся ў цэлым радзе агідніўшых злачынстваў супроць рабочых. Яны, карыстаючыся сваімі ведамі і давер'ем савецкай улады, імкнуліся усімі спосабамі шкодзіць справе будаўніцтва рабочымі сваёй дзяржавы і сацыялістычнага грамадзтва. Яны ўскладнялі разьвіцьцё прамысловасьці ў Савецкім Саюзе, пасылалі ўсё, што можна пасылаць, бяссэнсоўна траціні сродкі працоўных мас, стараючыся ўсіляк перашкодзіць росту і разьвіцьцю гаспадаркі краіны, яны штучна ствараілі ў краіне Саветаў гаспадарчыя затрудненьні. Усё злачыннае, што яны зрабілі, рабілася імі для таго, каб разурыць работу савецкай улады і разьвіцьцё гаспадаркі Саюзу Саветаў, ствараць у Саюзе хаос, выкідаць нездавальненьне савецкай уладай у масах народу, асабліва сялянства. Рабілася гэта імі па ўзгадненьні і пад кіраўніцтвам усіх рускіх капіталістых, якія эмігравалі з Расіі і жывуць зараз у Эўропе, а больш за ўсё ў Парыжы, і якія хочуць аднавіць сваю ўладу над рабочай клясай і сялянствам Саюзу Саветаў.

Зразумела, што рускія фабрыканты і банкіры не разьлічваюць вярнуцца ў Расію, узброеныя толькі сваімі кулакамі і кішэнямі. Справа ўсіх капіталістых адновлена ва ўсім сьвеце, справа гэта — ЭКСПЛЁАТАЦЫЯ ПРАЦЫ РАБОЧЫХ. Таму, натуральна, што рускія капіталістыя знайшлі сярод капіталістых Францыі і Англіі поўнае спачуваньне сваім злачынным мэтам. ПУАНКАРЭ - ВАЙНА, БРЫЯН, ЧЭРЧЫЛЬ і інш. авантурыстыя на службе капіталу ахвотна пайшлі насустрач мэтам расійскіх тэхнікаў і машынэнікаў. Францускім генштабам, супольна са шкоднікамі, якіх у Маскве судзіць народны суд, выпрацаван плян ваеннага нападу на Саюз Саветаў, — плян інтэрвэнцыі.

Агідная і разбуральная работа шкоднікаў у Саюзе Саветаў была распачата для таго, каб палічыць арміям інтэрвэнтаў разбойніцкі напад на Саюз Саветаў у 1930-31 годзе. Меркавалася справаказаць савецкую ўладу на вайну супроць рабочых і сялян Польшчы і Румыніі, а рабочым і сялянам Францыі, Англіі выступіць, быццам для абароны гэтых краін, — ужо знаёмічна падняволеных капіталу буйных імпэрыялістычных драпежнікаў. ВАЙНА КАПІТАЛІСТЫМ ВЫГАДНА, ЯНЫ ГАНДЛЮЮЦЬ ЗБРОЯЙ І ДОБРА НАЖЫВАЮЦЦА НА КРЫВІ РАБОЧЫХ. Яны ня спыняцца перад жахамі новай вайны, хаця ведаюць, што жах перавысіць усё тое, што было ў 1914-18 г. г. Капіталістыя не пашкадуюць зьнішчыць яшчэ 20-30 МІЛЬЁНАЎ РАБОЧЫХ І СЯЛЯН. Справа ўсіх капіталістых ва ўсім сьвеце адноўлена. Справа рабочых і сялян таксама адноўлена ва ўсім сьвеце: РАБОЧЫЯ І СЯЛЯНЕ ПАВІННЫ ВЫЗВАЛІЦЬ

Бязьлітасна змагацца з праваапартуністычнай практыкай

СЫГНАЛІЗУЕМ АБ БУЙНЕЙШЫХ ПРАРЫВАХ У РАДЗЕ ЯЧЭЕК ПУХАВІЦКАЙ ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ

Фрунзаўскі РК КП(б)Б павінен тэрмінова аздаравіць парт'ячэйку Дзяржпляну

Дабіцца бальшавіцкай работы

Выкрыццё буржуазных шкодніцкіх элементаў у галіне плянаваньня (Громан і К°) зусім выразна паказвае, наколькі плянавы фронт зьяўляецца і зьяўляецца вучасткам жорсткага клясавага змаганьня. Контр-рэвалюцыйная інтэрвэнцкая дзейнасьць агентаў сусьветнае буржуазіі, выкрытая ў саюзных плянавых органах, абавязвае грамадзкасьць і ў першую чаргу партыйныя арганізацыі рэспубліканскіх плянавых органаў праверыць—ці няма громанска-базараўскай спадчыны ў органах плянаваньня.

Партыйная ячэйка Дзяржпляну БССР ня здолела арганізаваць калектыў на выкрыцьцё асобных шкодных элементаў і момантаў у рабоце Дзяржпляну, на змаганьне з імі, ня здолела мабілізаваць масы на яшчэ больш поўнае выкананьне галоўнейшых задач, пастаўленых партыяй і пралетарыятам у момант разгорнутага наступленьня на капіталістычныя элементы па ўсім фронце. Такія пытаньні, як вывучэньне апарату, культурна-масавая работа, інтэрнацыянальнае выхаваньне, нерасьпёўская адозва ЦК УсеКП(б), сацыяборніцтва і ўдарніцтва, разгортваньне самакрытыкі—не атрымалі належнага адлюстраваньня ў рабоце ячэйкі.

Камісіяй па чыстцы і праверцы ячэйкі КП(б)Б было выяўлена шмат фактаў праяў прарата апартунізму ў рабоце асобных зьвеньняў апарату (засьмечанасьць статкораўскай сеткі кулакамі і варожымі элементамі, думкі аб тым, што «пастушкі» (батракі—**Г. А.**) ва ўмовах БССР зьяўляюцца тэй часткай наёмнай працы, якая не эксплёатуецца і г. д.).

Як-жа выконвала ячэйка прапановы, якія былі даны праверачнай камісіяй? Са спэцыялістымі, якіх у Дзяржпляне шмат, ніякай работы не вядзецца. Найлепшам, актыўнейшая з іх частка ня прыцягваецца да ўдзелу ў грамадзкай рабоце. Сярод часткі спэцыялістых ёсьць недаровыя шкодныя настрої, пораз'ненае ціперашняга этапу клясавага змаганьня, у прыватнасьці клясавая дыферэнцыяцыі, якая адбываецца сярод спэцыялістых. Адсутнь неразуменьне контр-рэвалюцыйнага зьместу шкодніцтва ў розных галінах народнае гаспадаркі. Труднасьці нэрыяду, які мы перажываем, наасобным спэцыялістыі расцэньваюцца з пункту погляду абыватэля.

Да гэтага часу нічога ня зроблена ў справе распрацоўкі марксыцка-ленінскай метадалёгіі плянаваньня, укараненьня яе ў плянавую работу. Так, рэдка якая плянавая сэкцыя мае свой плян работы, у сувязі з чым у рабоце ня толькі адсутнічае марксыцкая метадалёгія, але і ня ўная сыстэма. Як вынік гэтага, апарат Дзяржпляну бывае нагружан толькі 2-3 месяцы ў год—гэта ў часе складаньня кантрольных лічбаў. На працягу годзевяць месяцаў спэцыялістыя пры вострым недахвацэ кадраў нічога ня робяць.

Гэтымі днямі ў адзделе мэханікі выкрыта простае шкодніцтва. Матар'ял, які дасылаўся, меў 80 проц. браку, але ён шкоднікамі на працягу доўгага часу прымаўся, як добраякасны. Гэта шкодніцтва выкрыта вельмі позна таму, што партыйная арганізацыя Дзяржпляну ня ўчыніла сыгналаў насьценнай газэты.

Адсутнасьць масавае работы і здаровай самакрытыкі ў калектыве дала магчымасьць расквітнець бюракратызму, заціску ініцыятывы супрацоўнікаў па рацыяналізацыі вытворчасьці і росту апазыцыйнасьці сярод пэўнай часткі работнікаў Дзяржпляну. Нават ёсьць моманты заціску самакрытыкі, матар'ялы, якія вымяшчаюцца ў насьценгазэце, ігнаруюцца парт'ячэйкай і мясцкомам.

Як-жа ячэйка КП(б)Б рэагуе на такое становішча ў калектыве?

На адным закрытым партыйным сходзе ў прысутнасьці прадстаўніка Фрунзаўскага РК КП(б)Б, дзе абмяркоўвалася пытаньне аб становішчы калектыву, сход ня даў належнай палітычнай ацэнкі работы партыйнай ячэйкі. Сход прыняў пастанову аб тым, каб «аб мінулым не гаварыць, а выпраўляць, што рабіць у далейшым». Такая пастаноўка пытаньня прыняла да таго, што высьветліць недахопы і іх карэньні было немагчыма. У якасьці «рэцэпту» на далейшае было пастаноўлена: «Для абгаварэньня становішча калектыву склікаць адкрыты партсход». На гэтым сходзе дакладчыкам на фоне агульна-палітычных задач дакład быў пабудаваны так, што небясьпечнае становішча, якое ёсьць у калектыве, было пахавана пад апартуністычнай траскатнёй і фразэалёгіяй.

Трэба дадаць, што самакрытыка пасобных таварышоў выклікала подапучальныя выпады з боку дакладчыка. Заўвага радавога камуністага Федарынчыка аб сучаснай структуры апарату была расцэнена, як шкодная.

Сход не асудзіў, а фактычна ўзяў над сваю абарону паскрозь праваапартуністычныя выступленьні старшыні МК т. Лемака, які даводзіў, што «мы арганізаваць масы ня здолелі і ў далейшым гэтага зрабіць таксама ня здолеем».

Фрунзаўскаму РК партыі неабходна прыняць тэрміновыя захады да аздараўленьня становішча, якое склалася ў калектыве Дзяржпляну.

Г. АРЦЯМКОЎ.

„Манэўры" апартуністага

На чале **Крычаўскага** местачковага савету быў яўны апартуністы **Захараў**. За час сваёй работы ў якасьці старшыні м. с. ён адзіную ў правох большую палову ганяняроў. З другога боку ў выкананьні загатовак збожжа і бульбы Захараў даваў цьвёрдыя заданьні маламоцным сярэдняцкім гаспадаркам.

У выніку апартуністычнай практыкі кіраўніцтва Крычаўскага м. с. пляны па загатоўках і мабілізацыі сродкаў прадаўваюцца. Гэты савет у выкананьні гаспадарча-палітычных кампаній ганебна адстае, застаецца апошнім у раёне. Апартуністы Захараў апраўдваўся: «усё залежыць ад нас мы праводзілі, пытаньні загатовак і мабілізацыі сродкаў абмяркоўваліся на сходах бедноты, на агульных сходах, але, калі яны ня выконваюцца, мы за гэта ня можам адказваць». На справе выяўлялася, што з беднотай ніякай работы не праводзілася. Захараў для апраўданьня сваёй бязьдзейнасьці пахабна хлусіў.

Для таго, каб «выйсьці чыстым» за аднаўленьне ў правох гандляроў, Захараў рабіў падчыстку ў пратаколе пасяджэньня прэзыдыуму савету, дзе было запісана «ў правох аднаўіць», ён замяніў словам «адмовіць».

Райком партыі абвясьціў Захараву суровую вымову з папярэджаньнем і запрапанаваў фракцыі РВК зьняць яго з пасады старшыні местачковага савету. Па прыміраючыя адносіны да праваапартуністычнай практыкі **распушчана бюро крычаўскай ячэйкі КП(б)Б.**

ФОНКАЎ.

„Левых" загібшчыкоў —да партыйнай адказнасьці

Кіраўніцтва **Рычкоўскай** парт'ячэйкі грубе скрыўляла палітыку партыі ў пытаньнях пытаньні. Сакратар ячэйкі **Андрэеў** ня правільна арыентаваў ячэйку ў гэтым пытаньні, ігнараваў работу сярод бедноты, ня ліквідаваў з думкамі бедноты. Разам са старшынёй сельсавету Рыдзецкім ён правёў дадатковае абкладаньне с.-г. **падаткам у індывідуальным парадку 20 серадняцкіх гаспадарак.** Гэты «левы» загіб кулацкіх элементы выкарыстаў у сваёй варожай агітацыі супроць палітыкі партыі.

Тураўскі райком КП(б)Б выправіў гэту памылку, па-бальшавіцку ўдарыўшы па «левых» загібшчыках. **Сакратар ячэйкі Андрэеў зьнят з работы з абвяшчэньнем яму суровай вымовы з папярэджаньнем. Зьняты з работы старшыня сельсавету Рыдзецкі і справа аб ім перадана сьледчым органам на прадмет прыцягненьня яго да крымінальнай адказнасьці. Абвешчана суровая вымова т. Скапазубу,** які прымаў удзел у абкладаньні ў індывідуальным парадку сераднякоў, як прадстаўнік ад РК і ўпаўнаважаны сельсавету.

Для дэтальнай праверкі работы ячэйкі райкомам выдучана камісія.

Р.

У згодзе... з кулаком

Праваапартуністычная практыка ўвайшла ў сыстэму работы ряду ячэек **Пухавіцкай** раённай партарганізацыі. Канкрэтна гэта праваапартуністычная дзейнасьць заключаецца ў аслабленьні барацьбы супроць кулацкіх элементаў, змыканьні з кулакамі пасобных камуністых, якія знаходзяцца на кіруючай рабоце, у недапушчальнай бязьдзейнасьці ў справе калектывізацыі і выкананьні чарговых гаспадарча-палітычных кампаній.

Некаторыя калгасы раёну засьмечаны кулацкімі элементамі. Кулакі, якія пралезьлі ў калгасы, на працягу цэлага году праводзілі шкодніцкую работу, агітавалі за выхад з калгасаў, разьвівалі міжнацыянальную варожасьць, а кіраўніцтва гэтых калгасаў, апынуўшыся ў баладзе апартунізму, ніякай небяспекі ў кулацкай дзейнасьці ня бачыла. У калгас «Чырвоны май» прыняты кулакі—**Ажгірэй Андрэй, Фінскі, Ліпскі і Ажгірэй Кандрат.** Ўсе гэтыя асобы ў мінулым абкладаліся с.-г. падаткам індывідуальна, кожны з іх меў ад 20 да 60 гэкт. зямлі, па 3-4 кані, 13-15 шт. рагатай жывёлы. Кулак Ліпскі ў самы напружаны час работы вышаў з калгасу, **вывэзшы за сабой 7 бедняноў.** Гэтаму **факту кулацкай дзейнасьці, накіраванай на зрыў калектывізацыі, Блуская ячэйка і праўленьне калгасу не надалі ніякага значэньня.** Больш таго, калі той самы кулак Ліпскі пядаўна падаў заяву аб прыёме яго зноў у калгас, апартуністычнае кіраўніцтва калгасу **залічыла яго «кандыдатам у калгасьніці з 6-месячнай стажыроўкай».**

Для галавацяпаў, як кажуць, законы ня пісаны. Яны самі творыць законы, выходзячы з праваапартуністычнай установы «ўрастаньня кулака ў сацыялізм».

Былы арандатар млыну **Харытончык**, знаходзячыся ў калгасе «Зара», выкарыстоўвае ўсякія найменшыя труднасьці, якія сустракаюцца ў рабоце калгасу, у сваёй кулацкай агітацыі за выхад з калгасу. Гэты кулак на сходзе выступае з прапановамі папяўзь разрады аплаты працы беднякоў па матывах, што «бедняні ўвайшлі ў калгас без маемасьці». Характэрна, што кулак Харытончык ня толькі ня выйшаў з калгасу, а нават не сустракае належнага адпору з боку **Сінчанскай** ячэйкі, якая абслугоўвае калгас.

Праваапартуністычную практыку ячэек кулацкія элементы выкарысталі для ўзмацненьня сваёго варожага ўплыву на больш адсталую частку калгаснікаў. Як вынік гэтага, у часе зборкі ў калгас **Рэпіца** былі масавыя адмаўленьні выходзіць на работу.

Блуская ячэйка саўгасу Блонь, Мар'іна-Горская ячэйка і інш. не праводзілі ніякай работы па калектывізацыі. Некаторыя камуністыя разважаюць: «скончым кампанію, тады будзем брацца за калектывізацыю». Калгасы «**Гарапашнік**» і «**Авангард**» **адмаўляюцца прымаць у свой склад новых членаў.**

Паданыя факты сыгналізуюць аб буйнейшых прарывах у рабоце Пухавіцкай раённай партарганізацыі ў справе калектывізацыі сельскае гаспадаркі, аб нерапучай барацьбе супроць правага апартунізму на практыцы.

Я. М.

У адказ на фракцыйную дзейнасьць правых і „левакоў" рабочыя-ударнікі уступаюць у рады партыі

Рабочыя заводу «**Чырвоны Мэталісты**» (Віцебск) у ліку **43** чал. падалі заявы аб уступленьні ў партыю. Большасьць рабочых, уступаючых у партыю, маюць вялікі вытворчы стаж. Сярод іх т. **Лосеў** працаваў 40 год на вытворчасьці, **Стэпін** — 38 г., **Брусілін, Мілер і Мядзьведзкі** — па 35 г., **Богданаў, Ізраелін і Кавальскі** — па 25 г.

Напярэдадні сьвяткаваньня 13-ай гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі ў бюро парткалектыву заводу падалі заявы аб прыёме ў партыю інжынэр т. **Карневіч** і тэхнік **Гурэвіч**. Яны ў заяве пішуць:

«Уступаючы ў партыю, рабочыя **шчотачнай фабрыкі** заяўляюць: шчыльней згуртуемся вакол камуністычнай партыі і яе ленінскага кіраўніцтва — ЦК УсеКП(б). Будзем намагаць усе сілы на пасьляховае ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі, даючы бязьлітасны адпор усякім правым і «левым» праваапартуністычным праявам». Сярод уступаючых у партыю т. **Фінкель** мае 35-гадовы вытворчы стаж, **Ейзат** — 33 г., **Штаер** — 18 г. і **Жураўлёва** — 12 г.

ШУЛЬМАН.

У ВІЦЕБСКУ, ВОРШЫ, МАГІЛЕВЕ, ПОЛАЦКУ

ІДЗЕ ПАХОДНА... КЛЮБЫ

У трохдзенны тэрмін неадкладна аслабаніць клюбныя памяшканьні

Недаацэнка работы клюбаў—праява правага апартунізму на практыцы

XVI партзьезд адзначыў вялізарную ролю нашых клюбаў у агульнай сыстэме масавай культурна-палітычнай работы прафэсыянальных саюзаў.

Работа клюбаў, паводле пастаноў зьезду, павінна быць рашучым чынам перабудавана адзіна вымаганьням чарговых праблем сацыялістычнага будаўніцтва. Значэньне клюбу, як цэнтру культурна-масавай работы сярод арганізаванага пралетарыяту, сярод членаў прафсаюзаў, надзвычай узрастае.

На жаль, гэтыя асноўныя палажэньні, на шэсцох абмінулі пасобныя партарганізацыі і гарадзкія саветы. Большасьць РК КП(б)Б і гарсаветаў ня сталі на дапамогу клюбам, не ўзялі пастаяннага кіраўніцтва імі.

Больш таго. Мы сыгналізуем сёньня аб ганебных, «наплявацельскіх» адносінах некаторых арганізацый да прафсаюзных памяшканьняў, клюбаў і нардамоў і, у прыватнасьці, да справы фізычнага выхаваньня працоўных.

Рэкорд пабіт Віцебскам. Рад клюбаў буйнейшых саюзаў, фізкультурная зала, школа для дэфэктыўных дзяцей галавацянскім росчаркам пяра выводзяцца са строю—

Пры поўным ігнараваньні адпаведных пастаноў партыйных органаў адбіраюцца клюбы ў Магілеве, Полацку, Воршы.

Недаацэнку культурна-палітычнай, выхаваўчай работы ў сьценах нашых клюбаў нельга разглядаць інакш, як праяву правага апартунізму на практыцы.

Мы патрэбуем у 3-дзенны тэрмін аслабаніць гвалтоўна занятыя для іншых мэт прафсаюзныя клюбы.

Апартуністых, галавацяпаў—шкодніках культурнага будаўніцтва, якія ідуць супроць пастаноў партыі і ўраду, трэба прыцягваць да суровай партыйнай і судовай адказнасьці.

Работу клюбаў—на належную прынцыпова-палітычную вышыню!

На хвалях самацёку

Рабочыя-чыгуначнікі не ахоплены культурна-масавай работай

Прайшло паўгода з часу ўсесаюзнае клюбнае нарады і пастановы УсеЦСПС аб перабудове культурна-масавай работы прафсаюзаў, аб тым, што гэта работа павінна быць накіравана на канкрэтную барацьбу за выкананьне прамфінпляну, на правядзеньне генэральнай лініі партыі.

Але паўгода для **Гомельскага вучпрафсачу**—тэрмін невыстарчальны. Да гэтага часу культработа па вучастку, які абслугоўваецца гомельскім вучпрафсачам, не перабудавана. Гэта трэба кваліфікаваць, як яўны апартунізм і бяспрынцыпнае ігнараваньне дакладных і ясных дырэктыў партыі і УсеЦСПС.

Зьвернемся да фактаў.

На культнарадзе ў вучпрафсачы мясцкомы інфармавалі аб ходзе агляду культработы.

Мясцком **№ 7** адкрыта прызнаўся, што хваліцца яму няма чым. Культработы няма. Аб арганізацыі культсавету толькі думаюць. Для праверкі культработы (уласна кажучы і правяраць няма чаго) выбраны брыгады, якія існуюць на паперы.

У мясцкоме **№ 9** выбран непрацаздольны культсэктар. Няма насьценнай газэты, няма чырвонага кутка.

Пасьля распараджэньня вучпрафсачу аб праверцы культработы на мясцкоме **№ 4** былі скліканы гры нарады. На першай-жа нарадзе членаў мясцкому высьвятлілася, што культработа мясцкомам не праводзіцца. Апошні нумар «Ільлічоўкі» вышаў... паўтара месяца таму назад. Праверка культмасавай работы праходзіць без зацікаўленасьці рабочых мас. Ячэек добраахвотных таварыстваў няма.

У іншых мясцкомах (№№ 2, 3 і 5)—малюнак той-жа...

С. і П.

Вынік бязьдзейнасьці

У мінулым годзе старое ЦП саюзу саўгандальслужачых было распушчана. Галоўнымі абвінавачваньнямі зьяўляліся шуміле кіраўніцтва культработай, ігнараваньне дырэктыў вышэйшых прафорганаў, пяўменьне мабілізаваць ваком сябе актыў. Здавалася-б, што новае ЦП саюзу павінна было з самага пачатку зьвярнуць асаблівую сур'ёзную ўвагу на культурна-выхаваўчую работу, павінна было самым карэнным чынам перабудаваць яе на новых пачатках. Але нічога гэтага няма.

Новы загалчык культсэктару ЦП саюзу—**т. Слонімская** ня толькі ня ўнесла нічога новага, ня толькі не падыйшла глыбока да гэтага важнейшага вучастку прафработы, а наадварот, разлажыла ўсю работу, ігнаравала розныя кампаніі і т. д.

Возьмем клюбную работу. З вялікімі намаганьнямі ўдавалася праўленьню клюбу «заманіць» т. Слонімскую ў клюб. Яна быццам рабіла ласку, ідучы на насяджэньне праўленьня клюбу на 10-15 хвілін. І зразумела, што без кіраўніцтва культсэктару клюб з кожным днём паміраў. Клюб ператварыўся ў відоўню.

Ніякай работы не адчувалася. Кіраўнік культсэктару ЦП саюзу месяцамі не заглядваў у клюб. На працягу году ён ні разу не наведаў клюбнае бібліятэкі, ня гледзячы на тое, што яна была засьмечана розным хламам.

Культэстафэта ня цікавіла т. Слонімскую. Новыя мэтады і шляхі культработы зусім абмінулі ЦП саюзу. У клюбе не вядзецца ніякай работы.

Там халодна і жудасна. Сядзіць адзін толькі тэхнічны работнік.

Няма ні праўленьня, ні культпалітсавету.

І толькі калі апартуністычная практыка Слонімскай стала відавочна, калі забілі трывогу рабкоры,—ЦП саюзу прымушана было 19 лістапада ўхваліць пастанову аб зьняцьці Слонімскай з работы, выдазе яе са складу прэзыдыуму і пленуму ЦП саюзу.

Але вінавата не адна Слонімская. Вінавата, галоўным чынам, ЦП саюзу, якое на працягу цэлага году ня ведала, як вядзецца работа, і ня ўжывала рашучых мер.

Культработа—адзін з важнейшых і адказьнейшых вучасткаў работы. ЦП саўгандальслужачых трэба цяпер ліквідаваць тыя прарывы, што стварыліся на культурным фронце саюзу, у якім звыш 20.000 працоўных.

Л. Арын.

Рэкорд галавацяпства

Рэкорд па недапушчальна-галавацянскіх адносінах да культурнага будаўніцтва, мусіць, паб'юць на Беларусі працаўнікі **Віцебскага** гарсавету, на чале з старшынёю т. **Ягоразым.**

Аб Віцебску пісалася ўжо шмат... Але гэта нікольні не праймае віцебскіх работнікаў. Яны ня хочуць ведаць і выконваць дырэктыў партыі на культурным будаўніцтве, яны адносяць культурную справу да апошняй чаргі, яны здавальняюць запатрабаваньні наконт памяшканьняў за кошт ушчальненьня культустаноў.

Вось некалькі прыкладаў.

Віцебскі інстытут разумова-адсталых дзяцей літаральна выкінут са свайго памяшканьня, якое занята зараз міліцыяй. У свой час гарсавет абяцаў дабудаваць патрэбныя для школьных заняткаў і майстэрань інстытуту памяшканьні, але гэтага абяцаньня і пастаноў як сваіх, так і СНК ня выканаў.

Зараз разумова-адсталыя дзеці, ня маючы магчымасьці займацца ў школе і майстэрнях, ходзяць на горадзе, выбіваюць каменьнямі пакуль што шыбы і дабіраюцца да «сьветлых» галоў вінаватых у гэтым работнікаў...

Ёсьць пастанова ЦК УсеКП(б), СНК СССР і СНК БССР аб тым, каб усе школьныя памяшканьні, занятыя для іншых патрэб, былі вернуты школам. Віцебскі гарсавет таксама выносіць пастанову аб аддачы назад памяшканьняў, але тут-жа т. Ягораў заўважае:

— Ну што-ж, трэба запісаць... Нехай будзе, як гістарычны запіс!

Гэтымі днямі Наркаматам Асьветы атрымана тэлеграма, што па нейкіх меркаваньнях гарсавету з Віцебску высяляцца латыскі дзіцячы дом (адзіны ў БССР) і яўрэйскі.

Да рэчы, трэба сказаць, што над латыскім дзіцячым домам ужо доўгі час «вісіць меч» т. Ягорава. І толькі дзякуючы таму, што інспэктар Наркамасьветы т. Чарнабродаў месяцаў тры таму назад, будучы ў Віцебску, узьняў гэтае пытаньне перад партыйным камітэтам, перасяленьне ў той час было скасавана.

Таварышы з Віцебску, ці ня час ужо скончыць гэта? Ці ня час і вам выконваць дырэктывы партыі?

Мы патрабуем ад пракуратуры і РСІ заняцца гэтай справай і прыцягнуць вінаватых да адказнасьці.

Мы патрабуем большай зацікаўленасьці справаю культурнага будаўніцтва ад Віцебскай партарганізацыі на чале з гаркомам КП(б)Б.

Трэба зьнішчыць ганебныя «замахі» т. Ягорава!

ПЛАТУН.

Агідны „мэтад" ліквідацыі жыльлёвага крызісу

Ня гледзячы на адпаведную пастанову сакратарыяту ЦК КП(б)Б і тэлеграмы-пратэсты культсэктару ЦСПСБ, у радзе раёнаў узяты прафсаюзныя памяшканьні і клюбы.

Віцебскім гарсаветам узят клюб транспартнікаў з 3-х пакояў (**900 грузчыкаў засталіся без клюбу**). Там зараз агульнае памяшканьне рабочых—аўтабазы. У Віцебску-ж міркуюць забраць клюб мэдсанпрацы і клюб саўгандальслужачых.

Магілеўскім райкомам КП(б)Б і гарсаветам забраны клюбы працасьветы, піянэраў, камсамольскі клюб. Клюб саўгандальслужачых там яшчэ з мінулага году засыпан збожжам зараз-жа пасьля рамонту, на які саюз затраціў **14.000 руб.**

У Бабруйску гарсавет узяў фізкультурную залю, аддаўшы яе пад агульнае памяшканьне чырвонаармейскіх часьцей.

У Менску таксама забрана фізкультурная заля ў чыгуначнікаў. Ёсьць пастанова **Попацкага** гарсавету аб тым, каб забраць клюб саўгандальслужачых пад інтэрнат тэхнікуму.

У Рэчыцы імкнуцца пад агульнае памяшканьне забраць чырвоны куток таго-ж саюзу саўгандальслужачых.

Нарэшце, у **Воршы** міжсаюзны клюб нераданы тэкстыльнаму тэхнікуму.

Характэрна тое, што, ня гледзячы на паўторную пастанову сакратарыяту ЦК аб забароне займаць клюб працасьветы ў Магілеве, сакратар райкому заявіў, што «**толькі міліцыя можа ўзяць клюб назад**».

Усе гэтыя прыклады сьведчаць аб тым, што гаркомы КП(б)Б і гарсаветы, шукаючы выхаду з жыльлёвага крызісу, ідуць па лініі згортваньня, сьцісканьня культурна-асьветных установаў. Б 123 клюбаў па Беларусі толькі 35-40 годны для абслугоўваньня працоўных. На кожны клюб, які ўмяшчае 300 чал., прыходзіцца 2.000 рабочых, а з сем'ямі—звыш 6.000.

На тэй-жа лініі ідуць некаторыя ЖАКТы і адміністрацыі прадпрыемстваў, займаючы над сталоўкі і канторы чырвоныя куткі і фізкультурныя залі чыгуначнікі — у Менску і інш.).

Становішча—ненармальнае. Гарсаветы павінны вярнуць занятыя памяшканьні прафсаюзным арганізацыям, для культурна-асьветных мэт. Вінаватых у невыкананьні пастановы ЦК КП(б)Б трэба прыцягнуць да адказнасьці. **М. К.**

„Зьвязду"— у масы

Па Кастрычніцкім раёне падпіска на «Зьвязду» ў кастрычніку складае 53 проц. да ліку партыйцаў. Райком КП(б)Б разаслаў па ячэйках дырэктыўны ліст, у якім адзначыў недапушчальныя адносіны ячэек да папаўненьня цэнтральнага органу КП(б)Б і прапанаваў разгарнуць шырокую работу ў гэтай галіне. Але прайшоў месяц, а належнага зруху ў рабоце няма. **На пістапад падпіска складае 65 проц.** да ліку членаў і кандыдатаў партыі. Павялічэньне ёсьць, але яно ні ў якім разе не здавальняе.

Па большасьці прадпрыемстваў Кастрычніцкага раёну «Зьвязда» распаўсюджана ў мізэрнай колькасьці. На **чыгунцы** падпіска складае 12 проц. да ліку партыйцаў, на **гуце «Пралетары»** — 33 проц., на заводзе **«Полымя Рэвалюцыі»** — 17 проц., **«Энэргіі»** — 45 проц. **гарбарні** «Бальшавік» — 44 проц., **лямцевай фабрыцы** — 47 проц., **шчотачнай фабрыцы** — 49 проц., **Саюзтрансе** — 35 проц., **МЦРК** — 35 проц., **абутковых майстэрнях** — 50 проц. і інш.

Па Фрунзаўскім раёне становішча нялепшае. У кастрычніку **падпіска складала 67 проц.** да ліку партыйцаў, у лістападзе — **76 проц.** Па асобных прадпрыемствах становішча характарызуюць наступныя лічбы: на заводзе **«Дрэваапрацоўшчык»** падпіска складае 40 проц. да ліку партыйцаў, на дзяржаўным заводзе **«Пралетары»** — 42 проц., **Зільводзе** — 50 проц., ф-цы **«Камунэрка»** — 58 проц., ф-цы **«Чырвоны Тэкстыльшчык»** — 53 проц., **друкарні СНК** — 33 проц., **бровары «Беларусь»** — 60 проц. Калі ўлічыць, што частка падпіскі падае на беспартыйных рабочых і служачых, дык стане зусім ясным, што **партыйцы зусім слаба ахоплены падпіскай.**

Слаба праходзіць падпіска на «Зьвязду» і па ўстановах (Шкларгрэст, ДэТ, Беларзяжвыдавецтва, навукова-дасьледчы інстытут, Дзяржплян, Мэталятрэст, Белжылсаюз, «ГИЗ РСФСР», Белсельбуд, Белкамунбанк, Наркамат Аховы Здароўя, Пастэраўскі інстытут, Саюзхлеб, Белдзяржбуд, нервовая клініка і інш.).

Больш-менш здавальняюча стаіць справа ў Шэйтрэсьце, канектыве міліцыі, ЦПК, Белкаалсаюзе, рабфаку, Папертрэсьце, Белдзяржстраху, ВСНГБ, НК РСІ, Белмалжывёлсаюзе.

У цэлым радзе прадпрыемстваў і ўстаноў **наглядаецца значнае зьніжэньне падпіскі. Па хлебадобнай падпіске ў лістападзе складае 11 экз. супроць 27 у верасьні, па апараце МЦРК** — 15 экз. супроць 32, **у аддзяленьні хлебазаводу** — 10 экз. супроць 19, **цэнтральнай рабочай паліклінікі** — 4 экз. супроць 12, **Наркампрацы** — 18 экз. супроць 42, **па 2-м аддз. міліцыі** — 13 экз. супроць 26, **ашчадкасе** — 21 экз. супроць 30 і г. д.

Гэтыя даныя сьведчаць, што парт'ячэйкі ў большасьці сваёй не аддаюць належнай увагі справе распаўсюджаньня цэнтральнага органу КП(б)Б — газэты «Зьвязда». Кастрычніцкаму і Фрунзаўскаму райкомам КП(б)Б патрэбна сур'ёзна заняцца гэтай справай, праверыць, як выкананы даныя ячэйкам дырэктывы.

П.

ГЕРШМАН

ЧАТЫРЫ ВУЗЛАВЫЯ ПУНКТЫ

абсьледваньня вылучэнства ў БССР

ЦКК-НК РСІ і ЦСПСБ з 25 лістапада на 20 сьнежня бягучага году праводзяць масавы агляд становішча вылучэнства і работы з вылучэнцамі. Гэты агляд мае на мэце выявіць, як выконваюцца пастановы партыі, ураду і прафсаюзаў аб вылучэньні рабочых, батракоў, калгасьнікаў і беднякоў у савецкі, камэрацыйны, гаспадарчы і прафесыянальны апарат, а таксама на калгасную работу; наколькі сыстэматычна адбываецца вылучэньне і наколькі падрыхтоўка кадраў адпавядае тым запатрабаваньням, якія высоўваюцца ціперашнім нэрыядам перад нашым апаратам.

Партыя дабілася гігацкіх посьпехаў у справе алышчэньня савецкага апарату ад клясава-варожых, шкодніцкіх элементаў. Рабочая кляса пад кіраўніцтвам партыі нанесла рашучы ўдар па бюракратызьме, вылучыўшы ў савецкі апарат сотні і тысячы пралетараў, здольных змагацца за вырашэньне клясава-вытрыманую лінію і баявым тэмпы работы нашага апарату. Толькі апартуністы з права-«лявацкага» лягеру і фракцыянэры права-«лявацкага» блёку Сырцова-Ламінадзе ня бачаць дасягненьняў рабочае клясы ў справе паляпшэньня работы апарату, у справе яго арабочаньні і ўзводзяць паклёпы на органы пралетарскай дыктатуры. Дэмагогі з права-«лявацкага» блёку заяўляюць, што мы «на працягу году займаліся тым, што палепшалі апарат» ведамства, праводзілі чыстку, правялі рад рэарганізацый, а выходзіць, быццам апараты сталі працаваць горш». Зусім няма патрэбы даводзіць, на чый млын льюць ваду апартуністы з «права-«лявацкага» лягеру. Яны гэтым самым, хочуць яны гэтага, ці ня хочуць, дапамагаюць узмацненьню пазыцый клясава-варожых элементаў у іх змаганьні супроць дыктатуры пралетарыяту.

Партыя напосіла і будзе напосіць руйнуючыя ўдары па правым апартунізьме, які прадстаўляе галоўную небясьпеку на даным этапе, а таксама і па «левых» апартуністых, на дзяўбуніках і прымірэнцтве да ўхілаў ад ленінізму.

Вялікія посьпехі на гэтым важнейшым вучастку клясавай барацьбы ў справе арабочаньня дзяржаўнага апарату, яго спрашчаньня, патаньненьня і набліжэньня да працоўных мас мае і наша Савецкая Беларусь. У сувязі з чысткай савецкага апарату ў розных установы БССР вылучаны на адказныя пасады больш за **паўтары тысячы рабочых з вытворчасьці.** На калгасную работу ў ліх «25-тысячнікаў» накіравана **534 чал.** рабочых замест заданьня—500 чал. Заяў-жа ад рабочых, якія выказвалі сваё жаданьне пасхаць на вёску і дапамагчы справе сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, паступіла 1.363. Гэта выразна сьведчыць аб высокай палітычнай актыўнасьці рабочай клясы, выключнай адданасьці яе справе сацыялістычнага будаўніцтва. Гэтыя пралетарскія кадры базыруюцца сабе апраўдалі на рабоце ў калгасным будаўніцтве і ў савецкім апараце.

Мы ніколі не захапляемся і не павінны захапляцца нашымі посьпехамі. Клясавае змаганьне на гэтым важнейшым вучастку ня скончана. Яно і далей абвастрэцца. Яшчэ да гэтага часу ў асобных зьвеньнях савецкага апарату наглядаецца засьмечанасьць кляса-чужымі, сацыяльна-варожымі элементамі, якія тармозяць і перашкаджаюць нераможнаму сацыялістычнаму наступленьню. Выкрытыя моманты шкодніцтва ў органах рабочага забесьпячэньня ў прамысловасьці і сельскай гаспадарцы патрабуюць ад рабочае клясы асабліва вялікай пільнасьці на гэтым вучастку клясавага змаганьня.

Другі пленум ЦК КП(б)Б адзначыў, **што спраблема надрэў ва ўмовах узрастаючых тэмпаў сацыялістычнай рэканструкцыі народнай гаспадаркі, як і раней, застаецца важнейшай праблемай.** Вылучэньне рабочых, батракоў, калгасьнікаў і беднякоў на кіруючую работу займае ўжо вельмі значнае месца ў справе вырашэньня гэтай праблемы. Адшук, ня гледзячы на посьпехі, якія набыты ў справе вылучэньня, трэба з усёй рашучасьцю падкрэсьліць, што ў гэтай справе, асабліва ў галіне работы з вылучэнцамі, у нас далёка ня ўсё добра. Зьлёт вылучэнцаў, які пядаўна адбыўся ў **Кастрычніцкім раёне**, выявіў шматлікія факты ігнараваньня запіраньня вылучэнцаў, факты супраціўленьня арабочаньню апарату з боку бюракратычных і чыноўніцкіх элементаў. Матар'ялы рабочых брыгад, якія абсьледвалі ўмовы работы вылучэнцаў, падаюць шматлікія факты фармальных адносін да вылучэнцаў і злоўтаньць дапамогі ў іх рабоце. У **Белкалгасцэнтры, МЦРК, Белпаляводсаюзе** ёсьць факты простага запіраньня вылучэнцаў (назначэньне на тэхнічныя пасады, кур'ёрамі, перапісчыкамі). Наглядаецца таксама факты простага байкоту вылучэнцаў, які даходзіць да выдзеку. У Белмалымысловасаюзе вылучэнка **тав. Левіна** 5 раз прымацоўвалася да розных спэцыялістых і нідзе не атрымала дапамогі. Аналёгічны выпадак меў месца ў ашчадкасе з вылучэнцам **т. Асеенкам.** З боку кіраўніка Дзяржбанку **тав. Фэльдмана** праяўлялася простае імкненьне выжыць вылучэнца **тав. Станкевіча** і замяніць яго «сваім» чалавекам.

У рэзультаце такіх адносін наглядаюцца пасобныя выпадкі, калі вылучэнцы пакідаюць установы (Белкамунбанк, ашчадкаса) і імкнуцца пайсьці назад на вытворчасьць. Зусім правільна Кастрычніцкі РК КП(б)Б такія факты і адносіны да вылучэнцаў кваліфікаваў, як сабатаж і супраціўленьне з боку часткі рэакцыйна настроеных спэцыялістых дзяржапарату правядзеньню нераможнага мерапрыемства партыі па арабочаньні апарату. Партыйцы—кіраўнікі ўстаноў, парт'ячэйкі і прафарганізацыі ў гэтых выпадках правялі недапушчальнае прытуленьне сваёй клясавай чуласьці, чым абсьтэкуўна дамагалі эрыўу важнейшых пастаноў партыі.

Гомельская газэта «Палоская «Праўда» 19 лістапада падавала рад фактаў недапушчальных адносін да вылучэнцаў. **Выпоў апартуністычнае кіраўніцтва гомельскага ЦРК скарыстала 60 вылучэнцаў у якасьці работнікаў прыпаўку.** Гэта патрабуе ад гомельскага партыйнага кіраўніцтва і прафсаюзаў тэрміновага выпраўленьня апартуністычных скажэньняў і скарыстаньня вылучэнцаў на кіруючай рабоце, стварыўшы для іх належныя ўмовы.

Па ганебных фактах, якія мелі месца ў Борнах, дзе зьдзекі з вылучэнца прыводзілі яго

Шырэй разгарнуць падрыхтоўчую работу да перавыбараў саветаў

Раўняцца па Барысаву

23 лістапада адбылося пасяджэньне цэнтральнай выбарчай камісіі пад старшынствам тав. **Хацкевіча.**

Прадстаўнік **ЦСПСБ** зрабіў даклад аб ліквідацыі падрыхтоўчае работы прафесіянальных арганізацый да перавыбараў.

У дакладзе, аднак, ня было паказана, як выконваюцца дырэктывы ЦСПСБ і ў якім становішчы знаходзіцца зараз падрыхтоўчая работа на месцах. Тыя весткі, якія маюць цэнтральная выбарчая камісія і друк, паказваюць, што **падрыхтоўчая работа разгарнулася яшчэ невыстарчальна, асабліва сярод рабочых на прадпрыемствах.** На гэта паказалі даварышы, якія выступалі ў спрэчках.

Далей быў заслуханы даклад **аб рабоце ЦК КСУ да перавыбараў.**

Цэнтральная выбарчая камісія паказала ЦК КСУ на неабходнасьць зараз-жа прыступіць да масавай праверкі — як выконваюцца яго дырэктывы на месцах і дабіцца 100-процантнага ўдзелу беднаты і батрацтва ў перавыбарчай кампаніі.

З дакладу прадстаўніка **Барысаўскай раённай выбарчай камісіі** высьвятлілася, што ў Барысаўскім раёне разгорнута вялікая работа на падрыхтоўцы да перавыбараў.

Па горадзе ўжо складзены і праверены сьпісы выбаршчыкаў і друкуюцца сьпісы пазбаўленых выбарчых праў. Для лепшага ахопу ўсіх выбаршчыкаў увесь раён разьбіты на невялікія выбарчыя пучасткі. Да кожнага пучастку прыкамандоўваецца па адным прадстаўніку з райвыканкому. Арганізаваны брыгады па праверцы дасягнасьці саветаў, якія будуць рабіць судаклады на справаздачна-перавыбарчых сходах. Гэтыя ж брыгады будуць зьбіраць прапановы для складаньня новых наказаў.

Праводзяцца справаздачныя пленумы сельсаветаў. **Прынята пастанова аб пасьцы 10 раённых работнікаў для ўзмацненьня сельсаветаў,** што дасьць магчымасьць значна палепшыць склад кіруючых работнікаў амаль усіх сельсаветаў (у раёне ўсяго 23 сельсаветы).

Райпрафсавет разгарнуў падрыхтоўчую работу сярод рабочых барысаўскіх прадпрыемстваў.

У спрэчках т. т. адзначалі, што падрыхтоўчая работа на перавыбарах у Барысаўскім раёне праходзіць досыць актыўна. **Цэнтральная выбарчая камісія пастанавіла ўхваліць работу барысаўскай раённай выбарчай камісіі па падрыхтоўцы перавыбараў.**

Па дакладу прадстаўніка газ. «Савецкая Беларусь», цэнтральная выбарчая камісія пастанавіла ўхваліць пачын газэты ў правядзеньні савецкай эстафеты, прысьвечанай правядзеньню справаздачна-выбарчай кампаніі.

Дакклады ЦК ЛКСМБ, Наркамасьветы і Калгасцэнтру ня былі заслуханы з прычыны няяўкі дакладчыкаў з гэтых арганізацый. Цэнтральная выбарчая камісія пастанавіла запатрабаваць тлумачэньні аб прычынах іх няўкі.

Трэба шаноўна адзначыць, што **ня гледзячы на набліжэньне тэрміну перавыбараў** (у сьнежні) **цэнтральная выбарчая камісія нават ва ўстаноўленыя дні пасяджэньняў зьбіраецца вельмі неакуратна.** З агульнага ліку 22 членаў камісіі на пасяджэньні зьяўляецца ня больш 5-6 чал.

Агляд друку

Перавыбары саветаў у гэтым годзе будуць праходзіць пад знакам разгорнутага сацыялістычнага наступленьня на капіталістычныя элементы гораду і вёскі. Шалёнае супраціўленьне кулацтва на вёсцы і капіталістычных элементаў гораду ўжо зараз выяўляецца ў выступленьні розных школьніцкіх арганізацый, у радзе кулацкіх, антысэміцкіх і нацыянал-дэмакратычных выказак. Кулацкія і папоўскія «агітатары» на вёсцы апрацоўваюць бяднякоую частку, рыхтуюцца да перавыбараў.

У нашым артыкуле мы разгледзім, як наш партыйны і савецкі друк арганізуе падрыхтоўку да перавыбараў саветаў—гэтай важнейшай масавай палітычнай кампаніі.

* * *

«Савецкая Беларусь» пачала асьвятляць падрыхтоўку да перавыбараў саветаў з 1-га кастрычніка. За ўвесь час кампаніі газэта дала 18 падборак на галоўных пытаньнях кампаніі. Газэта зусім правільна пачала кампанію сваёю прапаноў па перавыбарчай кампаніі, увязваючы прапарцоўку адозвы ЦК УсеКП(б) з перавыбарамі. Далей газэта пачынае растлумачэньне выбарчай інструкцыі. Сыстэматычна вядзецца асьвятленьне пытаньняў пашырэньня калгаснага руху, работы сярод беднаты і жанчын, работы пісковых парт'ячэек у сувязі з перавыбарамі саветаў. Газэта ўцягвае ў перавыбарчую кампанію рабселькорыю і настаўніцтва, зусім правільна ўвязвае асьвятленьне «дэкады абароны» з падрыхтоўкай да перавыбараў саветаў.

Асабліва трэба адзначыць пачынальнае газэты ў арганізацыі ўсебеларускай саведкай эстафеты. «Старт» эстафеты ахапіле ўсе важнейшыя моманты, вакол якіх павінна весьціся падрыхтоўчая кампанія да перавыбараў саветаў і, блазмоўна, дасьць вялікі штурмок справе падрыхтоўкі. Усе газэты БССР павінны зараз-жа ўключыцца ў савецкую эстафету.

Зараз спыніўся на некаторых недахопах «Савецкай Беларусі». Закранаючы паасобныя бакі работы пісковых парт'ячэек, работы гарадзкіх і пісковых саветаў, работы з беднатой, калгасьнікамі і г. д., газэта амаль выключна карысталася фактамі адмоўнага характару. Адсюль у сялянскага чытача можа стварыцца ўражаньне, што наогул усюды саветы кепска працуюць. **«Савецкая Беларусь» ня здолела яскрава паказаць добрага сельсавету, добрых парт'ячэек, добрай работы з беднатой і г. д.**

Нарэшце, трэба паказаць на палітычна-блытаную фармулёўку ў адной з падборак. У нумары ад 11 лістапада мы чытаем наступную «шапку»: «Згуртаваць батракоў і беднякоў на лепшае правядзеньне перавыбараў саветаў», а далей ідуць наступныя радкі: **«Апіраючыся на калгасьнікаў, разгортваючы работу сярод беднаты,** узмацняючы саюз з сераднякам, праводзячы рашучае наступленьне на кулацтва і падучы бязьлітасную барацьбу з кулацкай агентурай»... Як відаць, «Савецкая Беларусь» у даным выпадку перабольшала пастанову XVI зьезду УсеКП(б) **аб апоры на калгасьнікаў** у важнейшых збожжавых раёнах і аб апоры на калгасьнікаў і беднату ў іншых раёнах. Трэ' было зірнуць і ў пастановы катрычніцкага пленуму ЦК КП(б)Б, дзе гаворыцца літаральна наступнае: «Апіраючыся на ўзрастаючую актыўнасьць калгасьнікаў і батрацка-бядняцкіх мас вёскі, узмацняючы саюз з серадняком...» (п. 2),—тады напэўна газэта не давала-б гэткай палітычна-няўразнай фармулёўкі.

«Рабочий» пачаў асьвятляць падрыхтоўку да перавыбарчай кампаніі 4-га лістапада, зьмясьціўшы гутарку з тав. Хацкевічам. Гэтым распачаў і скончыў «Рабочий» важнейшую палітычную кампанію. «Рабочий», мусіць, мяркуе, што рабочыя і сяляне, якія чытаюць газэты па расійскай мове, у перавыбарах саветаў Беларусі ня прымаюць удзелу (?!). Так асьвятляць важнейшую кампанію—проста ганьба.

«Беларуская Вёска», зьяўляючыся масавай сялянскай газэтай, павінна была мабілізаваць усю ўвагу на арганізацыю падрыхтоўкі перавыбараў саветаў, на вёсцы, тым больш, што ў першую чаргу будуць праходзіць перавыбары сельсаветаў, але ў сапраўднасьці бачым адваротнае. Кампанія пачынаецца 27 кастрычніка, зьявляецца некалькі выпадковых заметак. 1-га лістапада даецца яшчэ пара заметак, якія зьмяшчаюцца бяз усякай сыстэм і ляпцу. 19-га лістапада газэта надрукавала перавыбарчую інструкцыю. Вось і ўсё. Таварышы з «Беларускай Вёскі», вам ня шкодзіць павучыцца ў «Савецкай Беларусі» і ўключыцца ў савецкую эстафету.

Зусім нездавальняюча асьвятляе падрыхтоўку да перавыбарчай кампаніі **«Чырвоная Зьмена».** 13-га кастрычніка зьмешчана падборка аб удзеле камсамолу ў перавыбарчай кампаніі—праз 18 дзён, у нумары ад 31-га кастрычніка зьмяшчаецца рэзалюцыя ЦК ЛКСМБ на гэтым пытаньні. І толькі 22 лістапада «Чырвоная Зьмена» зьмяшчае спэцыяльную старонку аб удзеле камсамолу ў перавыбарчай кампаніі, аб рабоце з беднатой і аб арганізацыі новага прыліву ў калгасы ў часе перавыбарчай кампаніі.

Газэце «Чырвоная Зьмена» яшчэ шмат чаго трэба прарабіць, каб выканаць пастанову ЦК ЛКСМБ аб перавыбарах саветаў, трэба ўключыцца ў савецкую эстафету і праверыць удзел камсамолу ў перавыбарчай кампаніі.

«Палеская Праўда» ўключылася ў кампанію перавыбараў саветаў з кастрычніка месяца. За гэты час газэта дала некалькі ўстановачных перадавых аб задачах перавыбараў. Хаця несыстэматычна, але дана некалькі падборак на асьвятленьні работы гарсавету і матар'ялы аб перавыбарах. Недахопам «Палескай Праўды» зьяўляецца тое, што яна зусім выкінула са сферы свайго абслугоўваньня сельскія месцовасьці, зусім не асьвятліла падрыхтоўкі да перавыбараў сельсаветаў.

«Віцебскі Пралетары» прымае актыўны ўдзел у арганізацыі перавыбараў саветаў. Распачаўшы кампанію з 13-га кастрычніка, газэта вядзе ўпартую барацьбу за паляпшэньне работы гарсавету. З 13 кастрычніка па 18 лістапада зьмешчана 8 падборак, большасьць якіх бічуе непрацаздольнасьць гарсавету, узмацняючы гэта пытаньне з перавыбарамі саветаў. Газэта зусім правільна перанесла справаздачную кампанію гарсавету на суд фабрык і заводаў Віцебску. Аднак, вялікім недахопам «Віцебскага Пралетара» зьяўляецца тое, што газэта не абслугоўвае кампанію перавыбараў на вёсцы.

Раённыя газэты павінна ўзяць на сябе арганізацыю ўдзелу фабрычна-заводзкіх рабочых у перавыбарчай кампаніі сельсаветаў.

«Камуніст» (Бабруйск) на працягу ўсяго кастрычніка і лістапада асьвятляе падрыхтоўку перавыбараў саветаў. Газэта растлумачыла сваім чытачом новую інструкцыю, пачала праверку работы гарсавету і сельсаветаў, адзначым таксама і такую ініцыятыву газэты, як абвяшчэньне дэкады падрыхтоўкі да перавыбараў.

Нарэшце, трэба адзначыць, што і **«Зьвязда»** са спазьненьнем увялася за арганізацыю і асьвятленьне кампаніі перавыбараў. За гэты час у «Зьвязьдзе», апрача інструкцыі ЦВК СССР, было зьмешчана некалькі кіруючых артыкулаў і падборак аб ходзе падрыхтоўчай работы да перавыбараў як у цэнтральных органах, так і ў паасобных раёнах. Гэтага, зразумела, зусім мала. «Зьвязда», як ЦО КП(б)Б, павінна больш разгарнуць на сваіх старонках асьвятленьне задач партарганізацыі ў гэтай важнейшай палітычнай кампаніі.

* * *

Агульны недахоп усіх нашых газэт —гэта зусім слабая арганізацыйна-масавая работа. На старонках друку амаль няма паказу новых узораў падрыхтоўчай работы да перавыбараў—кіраўніцтва парт'ячэек гэтай кампаніяй, арганізацыі рабочых брыгад для дапамогі ў перавыбарах сельсаветаў, паказу іх канкрэтных дасягненьняў, лепшых узораў работы па ўцягненьні мас, складаньні наказаў—сустрэчных прамфінпляноў, па зборы рабочых прапаноў, выклікаў па сацспаборніцтва і г.д.

У падыходзячым адказным этапе кампаніі наш друк павінен выправіць гэты недахоп.

М. Фарбэраў.

Калдагаворная кампанія

Праверкай калдагавароў дабіліся зруху

1.200 рабочых віцебскай акупярнай фабрыкі 14 лістапада на сваёй канфэрэнцыі абмяркоўвалі вывады часовай кантрольнай камісіі аб выніках праверкі выкананьня калектыўнага дагавору. Праверка калдагавору ўскапыхнула рабочую масу. Сабрана звыш 450 прапаноў, накіраваных на палепшэньне вытворчасьці і сацспаборніцтва. Арганізавана 10 ударных брыгад і адна «сквозная» брыгада ў колькасьці 60 чалавек. Тэхнічны аддзел абязьцеіў сябе ўдарным і замацаваў сябе да канца пяцігодкі на фабрыцы. Усяго за гэты перыяд замацавалася на фабрыцы 250 рабочых. 32 рабочыя падалі заявы аб жаданьні ўступіць у партыю.

Гэтыя дасягненьні і значны рост актыўнасьці рабочых мас спрыялі выкананьню прамфінпляну. Праграма за кастрычнік выканана НА 93,5 ПРОЦ. Цэх па вырабе ахоўваючых акуляраў выканаў праграму НА 108 ПРОЦ.

Адначасова канфэрэнцыя рабочых акупярнай фабрыкі адзначыла рад недахопаў у выкананьні калдагавору бягучага году. Саюзныя органы не вялі патрэбнай барацьбы з цякучасьцю рабочай сілы. У выніку за год звольнілася 158 чалавек. Бюро рацыяналізацыі працавала слаба і ніхто на гэта не рэагаваў. Кепска працавала ТНБ. У выніку мы маем разьбежку ў зарплаце аднолькавых разрадаў. Прафсаюзныя арганізацыі мала ўвагі зварачалі на выкананьне якасных паказальнікаў. Таму заданьне па зьніжэньні сабекошту выканана толькі напалову, а заданьне аб узьнятьці прадукцыйнасьці працы выканана крыху больш чым на палову, прычым зарплата апярэдзіла прадукцыйнасьць працы.

Адміністрацыя фабрыкі парушыла калдагавор у частцы прыёму і звальненьня рабочых, выпучэньства, тэхнікі бясьпечнасьці, а сродкі, выгнаваныя на ахову працы, былі выдаткаваны толькі пад націскам фабкому.

Канфэрэнцыя адзначыла, што калдагавор ня выканан па многіх пунктах абодвума бакамі, і ў сваёй пастанове вызначыла рад мерапрыемстваў, накіраваных на перавыкананьне прамфінпляну ўдарнага кварталу.

Б. ВОЛГІН.

Прамфінплян у калдагаворы не знайшоў прытулку

Ціха і няпрыкметна прайшла калдагаворная кампанія на машына-будаўнічым заводзе «Полымя рэвалюцыі». Заводзкія арганізацыі недаацанілі палітычнага значэньня калдагавору. Таму вакол гэтага важнейшага пытаньня ня была мабілізавана рабочая грамадзкасьць, ніякай растлумачальнай работы аб значэньні гэтай кампаніі ня было праведзена. Праверка старога калдагавору прайшла бяз удзелу рабочых. Праверачныя брыгады налічвалі ўсяго 25 чалавек, што параўнальна з агульным лікам рабочых (450 чалавек), зьяўляецца зусім нязначным.

Слабае палітычнае кіраўніцтва кампаніяй дало сябе адчуваць. Усяго наступіла 20 рабочых прапаноў, сярод якіх **няма ні адзіяй прапановы вытворчага характару.** Затое сярод прапаноў ёсьць і яўна шкурніцкія. Напрыклад, кандыдат у члены КП(б)Б—**Рамашэўскі**—патрабуе выдачы некалькіх камплектаў спэцвопраткі.

У выніку складзены калдагавор не адпавядае тым задачам, якія пастаўлены перад рабочай клясай. Ні аднаго слова аб вытворчасьці, аб сацспаборніцтве і ўдарніцтве вы ня знойдзеце ў новым калдагаворы, які заключаны толькі да 1 студзеня 1931 году. (У сувязі з тым, што завод «Полымя рэвалюцыі» перайшоў да Металнаб'яднаньня ў пачатку жніўня, калдагавор заключаны на 3 месяцы). Пытаньні барацьбы з прагуламі, цякучасьцю рабсілы таксама абойдзены.

Бязумоўна, партасьць такога калдагавору вельмі нязначная. Парт—і прафарганізацыі заводу павінны выправіць сваю памылку і перазаключыць калдагавор на 1931 год на асноове сапраўднай ахову працы, былі выдаткаваны толькі пад націскам фабкому.

Канфэрэнцыя адзначыла, што калдагавор ня выканан па многіх пунктах абодвума бакамі, і ў сваёй пастанове вызначыла рад мерапрыемстваў, накіраваных на перавыкананьне прамфінпляну ўдарнага кварталу.

Б. ВОЛГІН.

Калгас „Ільліч" будуе сьвінагадоўчую гаспадарку

КАЛГАС «ІЛЬЛІЧ» НА СПРАВЕ ЗМАГАЕЦЦА ЗА ВЫРАШЭНЬНЕ МЯСНОЙ ПРАБЛЕМЫ. НЯ БУДУЧЫ УКЛЮЧАНЫМ У ПЛЯН БУДАЎНІЦТВА СПЭЦЫЯЛІЗАВАНЫХ ГАСПАДАРАК, КАЛГАС УЛАСНЫМІ СІЛАМІ РАЗГОРТВАЕ СЬВІНАГАДОЎЧУЮ ГАСПАДАРКУ. УЖО ПАБУДАВАНЫ СЬВІНАРНІКІ, У ЯКІЯ ПАСТАЎЛЕНА 13 СЬВІНАМАТАК. РАЗГОРТВАЕЦЦА НОВАЕ БУДАЎНІЦТВА. КАЛГАС УПЭЎНЕНЫ, ПІТО Ў БЛІЖЭЙШЫ ЧАС ЁН НАЛАДЗІЦЬ БУЙНУЮ СЬВІНАГАДОЎЧУЮ ГАСПАДАРКУ.

С.

СТАЦЬ НА ЧАЛЕ калгаснага прыліву

Узмацняючы калгасы і мабілізуючы масы адзінаасобнікаў—беднякоў і серадняковў на барацьбу з кулаком, штодзенна змагацца за пашырэньне калгаснае хвалі

МАЦНЕЙ АГОНЬ ПА КУЛАКУ І ЯГО АГЕНТУРЫ У ПАРТЫІ—АПАРТУНІСТЫХ УСІХ МАСЬЦЕЙ

Наперакор Буда-Кашалёўскім апартуністым

Узорная работа калгасу „Гром"

БУДА-КАШАЛЁЎСКАЯ. (Наш кар.). Калгас «Гром» зьяўляецца вялікім фактарам калектывізацыі ў Буда-Кашалёўскім раёне. **Яшчэ ўвесну громаўцы,** у выніку сапраўды бальшавіцкага правядзеньня веснавой пасеўнай кампаніі, **арганізавалі новы калгас** у вёсцы Іванаўка. У гэты калгас уступіла больш 30 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Громаўцы ўзялі на грамадзкі буксір народжаны імі калгас і дапамагалі яму ў рабоце.

І новыя калгасьнікі бліскуча спраўляюцца са сваімі задачамі.

Цяпер вярбоўшчыкі-громаўцы вядуць работу ў вёсцы Іванаўка па пераходзе ўсёй вёскі (100 гаспадарак) у калгас.

У бліжэйшых 12 вёсках вярбоўшчыкі правялі справаздачы калгасу перад адзінаасобнікамі, паказалі адзінаасобнікам перавагі калектыўнай гаспадаркі, растлумачылі ім калгасную арытмэтыку.

Вынікі бліскучыя. У трох вёсках—Берастоўка, Васільеўка і Марозаўскія хутары арганізавалі ініцыятыўныя групы па арганізацыі калгасаў. Цяпер ужо не адны калгасьнікі--вярбоўшчыкі а дзесяткі адзінаасобнікаў-беднякоў і серадняковў, загартаваных у змаганьні з кулаком, зьяўляюцца заядлымі агітатарамі за калгас.

Калгасьнікі калгасу «Гром» здолелі злучыць свае посьпехі з арганізацыяй калгаснага прыліву.

Буда-кашалёўская парт'ячэйка, на вачох якое знаходзіцца калгас «Гром», **амаль нічога не зрабіла для таго, каб дапамагчы калгасьнікам у іх змаганьні за новы калгасны прыліў.** Лічэйка пальцам не паварушыла для таго, каб скарыстаць посьпехі калгасу «Гром» для арганізацыі калгаснага прыліву ў раёне.

Буда-нашалёўская ячэйка, такім чынам, не скарыстала вялізарных магчымасьцяй для разгортваньня калгаснага руху. Затое кулак, скарыстаўшы яе праваапартуністычную практыку і прымірэнцтва да яе, шалёна павёў работу супроць калгасу і па зрыве калектывізацыі ў некаторых вёсках. Арганізацыя батрацка-бядняцкіх мас ячэйкай ігнаруецца.

Толькі калгасны актыў, пад кіраўніцтвам камуністага тав. Сапліцкага, уключыўся ў змаганьне за новага калгасьніка. Вынікі маглі-б быць яшчэ большымі, калі-б буда-кашалёўская парт'ячэйка зьнішчыла праваапартуністычную практыку і ўзяла бальшавіцкія тэмпы па арганізацыі новага калгаснага прыліву.

Райком павінен ужыць самыя рашучыя захады ў адносінах правых апартуністых, якія не жадаюць выконваць важнейшыя дырэктывы партыі, не жадаюць стаць на чале новага калгаснага прыліву, змагацца за гэты прыліў.

Е. С.

Новы калгас

САМАХВАЛАВІЧЫ. У МЯСТЭЧКУ ВУЗЬЛЯНЫ, САМАХВАЛАВІЦКАГА РАЁНУ АРГАНІЗАВАЎСЯ ЯЎРЭЙСКІ КАЛГАС. У КАЛГАС УЛІЛОСЯ КАЛЯ 40 ГАСПАДАРАК. УЖО ПРЫСТУПЛЕНА ДА АБАГУЛЕНЬНЯ МАЕМАСЬЦІ. СЯРОД АБАГУЛЕНАЙ МАЕМАСЬЦІ ЁСЬЦЬ ВАЛЕНАЧНАЯ МАЙСТЭРНЯ, ДЗЬВЕ ЧАСАЛЬНІ І ІНШ. КАЛГАС МАЕ ВЯЛІКІЯ ПЭРСПЭКТЫВЫ ДА ПАШЫРЭНЬНЯ.

ПАДЛЕСНЫ.

Бабруйскі РВК марудзіць

з афармленьнем калгасу

БАБРУЙСК. НА ПАСЁЛКАХ ПЛЕСЫ, КАВАЛЁЎСКАГА СЕЛЬСАВЕТУ, БАБРУЙСКАГА РАЁНУ, ЯШЧЭ МЕСЯЦ НАЗАД арганізаваўся калгас, у які запісалася 16 гаспадарак.

РАЙВЫКАНКОМ АБЯЦАЎ ПРЫСЛАЦЬ ТАВАРЫШОЎ ДЛЯ АФАРМЛЕНЬНЯ І КАНЧАТКОВАЙ АРГАНІЗАЦЫІ КАЛГАСУ, АЛЕ І НА СЁНЕШНІ ДЗЕНЬ ГЭТА ЗАСТАЕЦЦА ТОЛЬКІ АБЯЦАНЬНЕМ. Ні адзін з работнікаў райкалгасаюзу або райвыканкому ў новы калгас не зьяўляецца. Тым часам кулак вядзе шалёную агітацыю супроць арганізацыі калгасу.

Новыя калгасьнікі ўжо страцілі веру, што хто-небудзь дапаможа ім у арганізацыі калгасу.

КАНДРАТ.

НОВАЯ ХВАЛЯ

ў выніку калгасных справаздач

АЗАРЫЧЫ (НАШ КАР.). ЗА АПОШНІ ЧАС НАГЛЯДАЕЦЦА ВЯЛІКІ ПРЫЛІЎ БЯДНЯЦКА-СЕРАДНЯЦКІХ ГАСПАДАРАК У КАЛГАС «КУЛЬТУРА» (АЗАРЫЦКІ РАЁН).

ПРЫЛІЎ УЗМАЦНІЎСЯ ПАСЬЛЯ СПРАВАЗДАЧ КАЛГАСУ АБ ВЫНІКУ ПЕРШАГА КАЛГАСНАГА ГОДУ. СПРАВАЗДАЧЫ ПРАВОДЗІЛІСЯ ПА СХОДАХ СЯЛЯН СУМЕСНА З КАЛГАСЬНІКАМІ. НА АДНЫМ ТОЛЬКІ СХОДЗЕ СЯЛЯНАМІ БЫЛО ПАДАНА 20 ЗАЯЎ АБ ПРЫНЯЦЬЦІ Ў КАЛГАС. ПАСЬЛЯ-Ж СХОДУ БЫЛО ПАДАНА 10 ЗАЯЎ АБ ЖАДАНЬНІ АРГАНІЗАВАЦЬ НОВЫ КАЛГАС.

ЗА АПОШНІ ЧАС ПА АЗАРЫЦКІМ РАЁНЕ ЎСТУПІЛА Ў КАЛГАСЫ БОЛЬШ ЗА 100 ГАСПАДАРАК.

КІСЛОЎ.

Зруйнаваць ланцугі бязьдзейнасьці

БУДАЎНІЦТВА СЬВІНАРНІКАЎ У САЎГАСАХ „СЬВІНАВОДУ"—ПАД ПАГРОЗАЙ

НЕАДКЛАДНА РЭАЛІЗАВАЦЬ ДЫРЭКТЫВУ УРАДУ АБ ВЫВАЗЦЫ ЛЕСУ. ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ ПАБУДОВЫ ПАТРЭБНАЙ КОЛЬКАСЬЦЮ МАТАР'ЯЛАЎ. БЯРЭЦЕ ПРЫКЛАД З КАЛГАСУ „ІЛЬЛІЧ", ЯКІ З ПОСЬПЕХАМ ЗМАГАЕЦЦА ЗА ВЫРАШЭНЬНЕ МЯСНОЙ ПРАБЛЕМЫ

Нельга прызнаць, што ў ходзе будаўніцтва па сьвінагадоўчых саўгасах трэсту «Сьвінавод» наступіў пажэжны пералом. Першая дэкада лістапада не дала амаль ніякага зруху. Тэмпы будаўніцтва сьвінарнікаў парэйшаму ганебна невыстарчальныя. Такое становішча рэзка адбіваецца на ўкамплектаваньні сьвінагадоўчых саўгасаў і тармозіць сваячасовае выкананьне пляну. Укамплектаваньне саўгасаў «Сьвінаводу», паводле самых апошніх даных, праведзена толькі на 72,2 проц.

Становішча на вучастку будаўніцтва характарызуецца наступнымі данымі. На сёнешні дзень пабудавана 5.173 матачных і адкормачных сьвінасэц. Разам з раней пабудаванымі і прыстасаванымі будынкамі ў наяўнасьці ёсьць 13.921 месца, што складае 24.4 проц. патрэбнасьці. У працэсе будоўлі знаходзіцца 10621 месца. Дзе прычыны прарываў у выкананьні праграмы будаўніцтва? Бясспрэчна, галоўная прычына заключаецца ў пасіўнасьці адпаведных арганізацый, адсутнасьці баявымі тэмпамі, у бюракратызьме, пядбайнасьці, безадказнасьці, ігнараваньні важнейшых дырэктыў партыі і ўраду, што мае месца ў цэлым радзе зьвеньняў зацікаўленых устаноў. Чаго варты адзін той факт, што зараз сьвінагадоўчыя саўгасы адчуваюць рэзкі недахват лясных матар'ялаў. Ніяк дзіўна гучыць, што ў БССР — краіне лясоў — «не хапае» лесу для будаўніцтва. Зусім натуральна, што лес ёсьць. Справа заключаецца толькі ў тым, што пімат якія РВК і сьвінагадоўчыя саўгасы груба парушылі дырэктыву СНК БССР аб поўным сканчэньні да 20-га лістапада вывазкі матар'ялаў з лесу для будаўніцтва сьвінарнікаў. Такія саўгасы, як «Блонь», «Вызваленьне», імя Сталіна, «Негарэлае» і інш. не паклапаціліся сваячасова вывезьці лес і зараз сталі пад пагрозай поўнага зрыву будаўніцтва з-за адсутнасьці будаўнічых матар'ялаў.

Наступіўшыя маразы ўскладняюць становішча. Патрэбна тэрміновае правядзеньне ўсіх земляных работ з тым, каб будаўніцтва сьвінарнікаў разгортвалася бесьперапынна і ў зімовы перыяд. Рабочыя павінны быць забясьпечаны спэцвопраткай на зімовы час. Аднак, да сёнешняга дня гэта пытаньне ня вырашана і знаходзіцца ў палоне ведамсьцьвенных спрэчак.

Рэчыцкі завод «Інтэрнацыянал» ня выконвае нарадаў па забясьпячэньні будаўніцтва цьвікамі. Усе гэтыя непаладкі павінны быць зьяўчаны ў тэрміновым парадку. Трэба забясьпечыць бесьперабойны ход будаўніцтва з тым, каб праграма будаўнічых работ была выкапана ў максымальна кароткі перыяд.

Зноў канстатуем, што Наркамправы, як і раней, ня ўжыў дзейсных мерапрыемстваў па забясьпячэньні будаўніцтва рабочай сілай. Становішча з рабочай сілай па-ранейшаму застаецца вельмі напружаным. На будаўнічых работах занята зараз толькі 2.500 чал., між тым, як поўнае разгортваньне будаўніцтва патрабуе ня менш 5 тысяч.

Дырэктывы аб забясьпячэньні будаўніцтва рабочай сілай і аб вывазцы лясных матар'ялаў павінны быць безадкладна выкананы ў найкарацейшы тэрмін. Усякая марудносьць, усякае далейшае таптаньне на адным месцы—злачынства. Патрэбны самы карэнны зрух па ўсіх вучастках змаганьня за сьвінаводзтва, за сацыялістычныя фабрыкі мяса.

М.

Бязьмоўна, Наркамправы, Гамалгасбуд будаваць такія сьвінарнікі?

Скурсырэц—гарбарнай прамысловасьці

ПЛЯН СКУРЗАГАТОВАК НЯ ВЫКОНВАЕЦЦА.—СЛАБА ВЯДЗЕЦЦА БАРАЦЬБА З КАДУШНІЦТВАМ

ПРАГРАМА АБУТКОВАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ Ў 1931 Г. ПАВЯЛІЧАНА НА 2,5 МЛН. ПАР. НАМАГЧЫ ЎСЕ СІЛЫ, КАБ УЗМАЦНІЦЬ СКУРЗАГАТОЎКІ, КАБ ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ БЕСЬПЕРАБОЙНУЮ РАБОТУ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ. УДАР ПА КУЛАКУ—СПЭКУЛЯНТУ СКУРСЫРЦОМ!

Буйны рост гарбарна-абутковай прамысловасьці БССР (у 1931 г. павінна быць выпушчана 4,5 млн. пар абутку супроць 2 млн. пар у 1929-30 годзе) пры вострым дэфіцыце скурсырцу дыктуе неабходнасьць прыняць рад мер для забясьпячэньня бесьперабойнай работы прамысловасьці.

Асабліва значэньне набывае зараз мабілізацыя ўсёй грамадзкасьці вакол пытаньняў загатовак скурсырцу і здачы апошняга дзяржаўнай прамысловасьці. Адзін той факт, што ва ўсіх куткох Савецкай Беларусі арганізаваны камісіі садзейнасьці скурзагатоўкам, гаворыць за тое, што шырокія масы працоўнага сялянства зразумелі ўсю важнасьць пытаньня скурзагатовак і забясьпячэньня сырцом гарбарна-абутковай прамысловасьці.

Трэба падкрэсьліць, што загатоўкі скурсырцу па БССР праходзяць яўна нездавальняюча. Плян загатовак на лістапад за 20 дзён выкананы па буйным сырцу на 55,3 проц., па дробным — на 34,2 проц., па новых відах загатовак: сьвіных скурах — на 31,4 проц., па сабачых — на 22,7 проц. За апошнюю дэкаду мы заўважаем некаторае ўзмацненьне тэмпаў загатовак, але яно не забясьпечвае поўнага выкананьня заданьня.

Прычына нездавальняючага ходу загатовак — **апартуністычныя адносіны мясцовых арганізацый, якія недаацэньваюць значэньня кампаніі.**

За апошні час значна павялічылася асядзьленьне скурсырцу ў сялянскай гаспадарцы. Ва многіх мясцох разьвіта пераапрацоўка скурсырцу ў калушках, кулак-спэкулянт выпускае прадукцыю дрэннай якасьці, скарыстоўваючы труд насьцы забясьпячэньня рынку скурзаварам і абуткам і востры дэфіцыт сырцу.

Толькі за апошні час па БССР у 205 населіўчых пунктах выяўлена 265 нелегальных кадушачных прадпрыемстваў, у якіх выкрыта каля 25.000 штук рознага скуру сырцу. У паасобных кадушачніках знойдзена больш за 1.000 шт. скуру (Койданаўскі раён). Кадушачнікі працуюць амаль легальна (Высачанскі раён); па Ўваранцкім раёне пад носам сельсавету працавалі два кадушачнікі, сельсавет аб іх ведаў, але ніякіх мер барацьбы ня ўжываў.

Адміністрацыйныя органы слаба змагаюцца з таёмнай пераапрацоўкай сырцу (кадушніцтвам). Судовыя органы падыходзяць зусім мяцка да гэтае справы, абмяжоўваючыся толькі грашовымі штрафамі. У Рагачоўскім раёне былі заслуханы 4 справы аб кадушачніках. Суд абмежаваўся грашовымі штрафамі, ня гледзячы на тое, што некаторыя з падсудных ужо раней штрафаваліся. У гэтым-жа раёне былы ўласьнік гаўбаці Азараў пад «шыльдай» калгасьніка займаўся пераапрацоўкай скурсырцу і вёў агітацыю сярод калгасьнікаў, каб не здаваць сыроду дзяржаве. Ён аштрафаваны толькі на 50 рублёў.

Пракуратура часта, замест дапамогі ў барацьбе з нелегальнай пераапрацоўкай, затрымлівае, марыпуе справы аб кадушачніках. У Асіпавіцкім раёне ў пракурора Мядзоўкі [illegible] ня [illegible] ня [illegible] ня

Крытыка і бібліяграфія

Супроць апалёгіі беларускай кандрацьцеўшчыны

С. П. Марцелаў. Супроць беларускае кандрацьцеўшчыны. Працы Беларускага Навукова-Дасьледчага Інстытуту сельскай і лясной гаспадаркі імя **У. І. Леніна** пры СНК БССР. Аддзел Эканоміі і арганізацыі сацыялістычнай сельскай гаспадаркі. т. XI, вып. Бел. Дзярж. выдав. Менск 1930 г. тыраж 10.000. Цана 35 кап.

Контр-рэвалюцыйная кандрацьцеўшчына і яе разнавіднасьці—беларускі нацыянал-дэмакратызм крытыкуюць зараз увагу усёй партыі, усіх працоўных на тольки Савецкага Саюзу, але і інш. краін. Вось чаму выкрыцьцё контр-рэвалюцыйнай сутнасьці кандрацьцеўшчыны, яе буржуазна-рэстаўрацкай праграмы і тактыкі зьяўляецца актуальнейшай задачай сучаснасьці.

Неабходна віталь усякую работу, якая дае марксыцка-ленінскае асьвятленьне кандрацьцеўшчыны і не разнавіднасьці—беларускага нацыянал - дэмакратызму. Адначасова з гэтым неабходна даваць самы рашучы адпор апартуністычным імкненьням затушаваць контр-рэвалюцыйную сутнасьць кандрацьцеўшчыны і гэтым самым дэзарыентаваць працоўныя масы у пытаньнях кандрацьцеўшчыны. На шлях затушоўваньня і нават яўнай абароны беларускай кандрацьцеўшчыны і не паасобных прадстаўнікоў стаў у рэцэнзаванай работе тав. Марцелаў.

Перш за ўсё падзвычай зьдзіўляе вельмі сьмелая думка аўтара, што **«беларускі нацыянал дэмакратызм у аграрным пытаньні не пасьпеў яшчэ скласьці згробныя тэорыі сваіх поглядаў і таму нам даводзіцца мець справу толькі з элемэнтамі гэтае тэорыі з першымі, часамі вельмі прымітыўнымі крокамі у гэтым кірунку!!»** (стар. 21-22—курсіў наш—П. П.).

Чым, як не яўнай абаронай контр-рэвалюцыйнага беларускага нацыянал-дэмакратызму можна тлумачыць думку аўтара пасьля таго, як камуністычнай партыяй Беларусі у апошнія гады досыць яскрава выкрыты ўстаноўкі нацыянал-дэмакратаў на капіталістычны шлях разьвіцьця сельскай гаспадарки Беларусі праз хутары і дробныя пасёлкі. Гэтыя установкі чырвонай ніткай праходзяць па ўсіх «навуковых» працах нацыянал-дэмакратаў, асабліва яны выявіліся у працах Ждановіча, Місьлякова, Гарацкага і іншых. Буржуазная тэорыя нацыянал-дэмакратаў атрымала свой яскравы адбітак у аграрнай палітыцы НКЗ у перыяд прымусоўчынны, у час фарсіраванага насьпяшаньня кулацкіх хутароў і дробных пасёлкаў (па сутнасьці тых-жа хутароў).

У сьвятле гэтага зусім беспадстаўным выглядзіць пьверджаньне аўтара, што «беларускі нацыянал-дэмакратызм у аграрным пытаньні не пасьпеў яшчэ скласьці згробнае тэорыі сваіх поглядаў і што»... даводзіцца мець справу толькі з элемэнтамі гэтае тэорыі, з першымі, часамі вельмі прымітыўнымі крокамі ў гэтым кірунку».

Паменшаўшы ролю контр-рэвалюцыйнага беларускага нацыянал-дэмакратызму, тав. Марцелаў бярэ пад сваю абарону заядлага кандрацьцеўца—нацыянал-дэмакрата Смоліча, кажучы, што **«Смоліч зьяўляецца толькі эфэрэю гэтага мэтадалёгічнага балота»** (неонародніцтва—П. П.) (стар. 65—курсіў наш—П. П.).

На запытаньне аб тым, як трапіў Смоліч у школу неонародніцтва, тав. Марцелаў адказвае: што **«аўтар... залез туды не таму, што гэтая школа яму падабаецца, а дзякуючы сваёй, мякка кажучы, неасьцярожнасьці...** (стар. 73-курсіў наш—П. П.).

Белыя Смоліч. Як яно не пашкадаваць, што ён на сваёй неасьцярожнасьці трапіў да неонародніцтва, якія, на думку тав. Марцелава, яму зусім не падабаюцца.

Трэба згубіць усякае класавае пачуцьцё, каб бачыць у Смолічу толькі ахвяру «мэтадалёгічнага балота», а не заядлага класавага ворага, які нават чураўся ўжываць тэрмін «савецкая ула» і які сьвядома змагаўся супроць дыктатуры пралетарыяту.

І вось гэтага контр-рэвалюцыянера абвяшчае ўзяц пад сваю абарону камуніст Марцелаў.

Упаўны у тым, што Смоліч, пад уплывам раньняй крытыкі Марцелава, стаў на правільны мэтадалёгічны шлях, Марцелаў нават рэкамендуе апошнюю працу Смоліча «Сельска-гаспадарчыя раёны Беларускае Савецкае Сацыялістычнае Рэспублікі ў 1927-1928 годзе» (выд. 1930 г.), як працу, якая «мае нямат чаго, блаумоўна, карыснага» (стар. 74). Ня лічачы магчымым даваць зараз поўную ацэнку паказанай працы Смоліча, (што будзе зроблена ў хуткім часе) скажам толькі, што гэта праца цалкам набудавана на буржуазнай мэтадалёгіі, на мэтадалёгіі буржуазных рэстаўратараў Чаянава, Студэнскага і іншых і ні ў якім разе ня можа быць карыскай для сацыялістычна будаўніцтва.

Усё гэта сьведчыць аб тым, наколькі тав. Марцелаў нядоцэнь бачыць клясавага ворага і змагацца з ім. Замест поўнага выкрыцьця Смоліча, як заклятага ворага савецкае ўлады, тав. Марцелаў пастараўся выгараджаць яго, нават з такой з вуліку погляду — Марцелава ганьбы, як «мэтадалёгічнае балота» і сам цалкам шпрат у апартуністычным балоце.

Ня сьмыслючыся на іншых памылках у рэцэнзаванай работе, прыходзіцца адзначыць, што работа зьяўляецца шкодная, бо яна ні ў якім разе не дае бальшавіцкай ацэнкі контр-рэвалюцыйнай ролі беларускага нацыянал-дэмакратызму і яго паасобных прадстаўнікоў і дэзарыентуе чытачоў у пытаньнях кандрацьцеўшчыны і не разнавіднасьці на Беларусі нацыянал-дэмакратызму.

П. ПІНЧУК.

Дадатковай падпіскай на пазыку

Узмацнім фінансавую базу пяцігодкі

На вікрыцьцё плянаў інтэрвэнтаў рабочая класа БССР адказвае новым магутным уздымам творчага энтузіязму—дадатковай падпіскі на пазыку—«Пяцігодка—за чатыры гады» для паскарэньня тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва, для ўзмацненьня абароназдольнасьці краіны.

* * *

— Агульна-гараджская нарада камісій садзейнасьці дзяржкредыту г. Менску, на пасяджэньні 24 лістапада, адзначалосна пастанавіла **прыняць выклік камісіі садзейнасьці газэты «Зьвязда» і правесьці дадатковую падпіску на пазыку «Пяцігодка—за чатыры гады».** Дадатковая падпіска зьявіцца лепшым адказам інтэрвэнтам і шкоднікам контр-рэвалюцыянэрам. Нарада прызнала мэтазгодным арганізаваць конкурс паміж камісіямі садзейнасьці на лепшую падпіску на пазыку, на 100-процантны ахоп рабочых і служачых, на ўцягненьне ў кампанію новых кадроў рабочых.

* * *

МАГІЛЕЎ. (Наш кар.). Па гораднае разгарнулася дадатковая падпіска на пазыку «Пяцігодка—за чатыры гады». Рабочыя гарбарні імя Сталіна падпісаліся на 5.720 руб. Рабочыя і служачыя чыгункі «Расмасдор» падпісаліся на 2.400 руб. Падпіска працягваецца.

* * *

— Міліцыянэры і камскład 1 аддзяленьня Менскай гарадзкой міліцыі, на спробы шкоднікаў падарваць абароназдольнасьць СССР, адказваюць дадатковай падпіскай—ужо сабрана падпіскі на 780 руб. Выліканы на сацпаборніцтва ўсе аддзяленьні міліцыі г. Менску і БССР.

Для ўзмацненьня аховы заводаў і фабрык агульны сход міліцыянэраў пастанавіў арганізаваць ударную брыгаду пад назвай «наш адказ шкоднікам».

* * *

— Пленум Юлікаўскага сельсавету, Любанькскага раёну, абвясьціўшы сябе мабілізаваным для ліквідацыі прарываў у фінансавым плане. Удзельнікі пленуму на сходзе падпісаліся на пазыку «Пяцігодка—за чатыры гады» на 250 руб. і ўнесьлі тут-жа грошы. Члены сельсавету ўзялі на сябе абавязак рэалізаваць суму аблігацый сярод сялянства і выклікалі пасьледаваць іх прыкладу ўсіх членаў сельсавету Любаньскага раёну.

* * *

— Ад прызыўнікоў—беларусаў нараджэньня 1908 году, якія прыняты ў №-скі полк у гор. Жыдры, атрымана паведамленьне, што у адказ шкоднікам і апартуністым, яны падпісаліся на пазыку «Пяцігодка за чатыры гады»—кожны на 10 рублёў.

* * *

Дадатковая падпіска на пазыку на **калектыве СНК БССР** праходзіць з вялікім посьпехам. Сума дадатковай падпіскі складае ўжо 1.685 руб.

Рэалізаваны дасягнула 75 проц. месячнай заработнай платы.

* * *

— Рабочыя **фабрыкі «Беларуска»** дадаткова падпісаліся на пазыку на 2.000 руб.

* * *

— ХОЦІМСК. (Наш кар.). Работнікі **Хоцімскага РВК** правялі дадатковую падпіску на 1.340 руб. і выклікалі на спаборніцтва Касьцюковіцкі і Клімавіцкі РВК.

ШВЭЙНЫЯ МАШЫНЫ—У КЛАДЧЫКАМ АШЧАДКАС

Каб даць працоўным магчымасьць набыць швейную машыну, СНК СССР прапанаваў усесаюзнаму аб'яднаньню машынабудаўніцтва забраніраваць 500.000 швейных машын вытворчасьці 1931-32 году для выдачы ўкладчыкам кас, якія наконцы кэтавыя ўклады ў разьмеры кошту машыны.

Для продажу праз ашчадкасы бранёюцца машыны наступных марак: ручныя машыны 15-й клясы (цэнтральна-шпульныя) па 82 руб. за машыну, ручныя машыны 127 клясы (з рухомым чаўнаком) па 72 руб., нажныя машыны 15-й клясы (цэнтральна-шпульныя) па 109 руб. і габінэтныя машыны па 132 руб.

Бранёзаваныя машыны разьмяркоўваюцца па 5 партый. Першая партыя будзе выдавацца з 1 красавіка па 30 чэрвеня 1931 году, другая партыя з 1 ліпеня па 30 верасьня 1931 году, 3-я партыя—з 1 кастрычніка па 31 сьнежня 1931 году, чацьвертая партыя—з 1 студзеня па 1 красавіка 1932 году і 5-я партыя—з 1 красавіка па 31 мая 1932 году.

Па Савецкай Беларусі

Дэманстрацыя пралетараў Віцебску

ВІЦЕБСК. (Наш кар.). 22 лістапада адбылася агульна-гараджская дэманстрацыя, прысьвечаная **«дэкадзе абароны».** Адразу-ж пасьля работы пралетары Віцебску выйшлі на вуліцу дэманстрацыі свару гаротуасьць стаць на абарону пралетарскай краіны.

На плошчы Леніна адбыўся вялікі мітынг, у якім прыняло ўдзел каля 15 тысяч працоўных.

— На пагрозы імпэрыялістычнай інтэрвэнцыі адказам узмацненьнем сувязі з Чырвонай арміяй, выкананьнем пяцігодкі за чатыры гады, пагалоўным уступленьнем у рады Ассавіяхіму,—так заявілі працоўныя Віцебску.

Выключыць з тэхнікуму кулацкага агента

ПОЛАЦАК. (Наш кар.). На сходзе студэнтаў Полацкага дарожна-будаўнічага тэхнікуму места месца выявака кулацкага агента — студэнта тэхнікуму **Васіля Хуцкага.** Хуцкі прабаваў «давесьці», што «пачатак гаспадарчага году алтэрнаванымі таму, што партыя ўбачыла, што пяцігодка ня зможа быць выкапана за чатыры гады». Студэнты тэхнікуму далі рашучы адпор выказьням Хуцкага і патрабуюць выключэньня яго з тэхнікуму.

Мабілізацыя сродкаў прахо-дзіць нездавальняюча

БАБРУЙСК. (Наш кар.). Работа па мабілізацыі сродкаў насельніцтва пастаўлена ў раёне вельмі дрэнна. У радзе сельсаветаў спагнаньне с.-г. падатку ідзе чарапашымі тэмпамі. **Рымавецкі** сельсавет спагнаў усяго 36,6 проц. заданьня, **Любоніцкі** — 30,3 проц., **Каменскі** — 49,9 проц.

Надаўна Бабруйскі райвыканком абвясьціў вымову **Мальеўскаму** сельсавету за слабую работу па правядзеньні сакмабкладаньня. Ня гледячы на гэта, сельсавет не разгарнуў яшчэ работы належным тэмпам.

Праверка выкананьня кантрольных лічбаў паянакапленьня па бабруйскім ЦРК за кастрычнік і лістапад паказала, што ў гэтай галіне амаль нічога ня робіцца. **Кастрычніцкае заданьне выканана ўсяго на 34 проц.**

Першая палова лістапада дала яшчэ больш нізкі процант выкананьня плану.

Патрэбны рашучыя меры для ўзмацненьня работы па мабілізацыі сродкаў насельніцтва.

Справа шкоднікаў грамадзкага харчаваньня

Прыгавор

24 лістапада нарсуд 3 вучастку вынес прыгавор па справе шкоднікаў грамадзкага харчаваньня. Былы дырэктар каўбаснай фабрыкі **Кірстукас** прысуджаны да 1 году прымусовых работ; загадчык разрубачнага цэху хладабойні **Янушкевіч** — да 9 месяцаў прымусовых работ; старэйшы майстар каўбаснай фабрыкі **Фрейшар** і загадчык кішачнага складу хладабойні **Шварц** — да 3 месяцаў прымусовых работ. Падсудная **Пучна** суд пастанавіў звольніць з пасады дырэктара віцебскага аддзяленьня «Белмяса» з забароной служыць у дзяржаўных, кааперацыйных і грамадзкіх установах на праняту двух год; мясазагатоўшчык **Гітлін** прыгавораны да 4 месяцаў прымусовых работ. **Сьмірноў і Манюкевіч** апраўданы.

Інжынэры-ударнікі

МАГІЛЕЎ. (Наш кар.). 12 інжынэраў і тэхнікаў магілёўскай канторы «Запжелдорстроя», у адказ інтэрвэнтам абвясьцілі сябе ударнікамі імя 3-га году пяцігодкі і замацавалі сябе на будаўніцтве да канца пяцігодкі.

МЕНСК

Прыезд прадстаўніка ЦК МОПР'у СССР

У Менск прыехаў загадчык сэктару агітацыі і прапаганды ЦК МОПР'у СССР тав. УТКЕС, які прыме ўдзел у рабоце 3 усебеларускага зьезду МОПР'у.

Усебеларускі зьезд МОПР'у

Учора, у 7 гадз. вечара, у клюбе Гарсавету адкрыўся трэці ўсебеларускі зьезд МОПР'у. Адкрываючы зьезд, старшыня ЦК МОПР'у БССР — тав. Клыс заклікаў усіх монпраўцаў прыняць яшчэ больш актыўны ўдзел у сацыялістычным будаўніцтве нашай краіны і ў рабоце па інтэрнацыянальным выхаваньні працоўных.

У зьездам адпагалосна прыняты пратэст супроць контр-рэвалюцыянэраў—шкоднікаў, якія зьяўляюцца агентурай інтэрвэнтаў. Зьезд у сваёй пастанове патрабаваў, каб шкоднікі былі прыкараны да вышэйшай меры пакараньня.

З зьездам пасланы прывітальныя тэлеграмы ЦК УсеКП(б), ЦК КП(б)Б, выканкому і ЦК МОПР'у СССР і барацьбітом рэвалюцыі, якія знаходзяцца у казэматах і турмах Польшчы і Зах. Беларусі.

Пад бурныя воплескі заслухоўваецца прывітальная тэлеграма зьезду ад Вюртэмбергскай арганізацыі МОПР'у.

З дакладам аб рабоце выканкому і ЦК МОПР'у СССР выступіў прадстаўнік ЦК МОПР'у СССР—тав. Уткес.

Арк. ЗАРУБЕЖНЫ.

Сацыяльны склад студэнтаў БДУ палепшыўся

Калегія Наркамасьветы гэтымі днямі заслухала даклад аб укамплектаваньні БДУ. У гэтым годзе сацыяльны склад студэнтаў значна палепшыўся. Прынята 350 чалавек на першы курс, супроць 174 у мінулым годзе. На рабфакі прынята 2.783 рабочых, супроць 657 у мінулым годзе.

Калегія адзначыла, што ў выніку невыстарчальнай увагі з боку апарату Наркамасьветы і мясцовых інспэктарыятаў, позьмята разгортваньня вярбовачнай работы,—**пэдагагічныя ВНУ і тэхнікумы** ня выканалі поўнасьцю плянаў укамплектаваньня. На пэдфак БДУ прынята на першай курсы 33 проц., замест 40 проц., вызначаных плянам, у пэдінстытуты БССР — 22,7 проц. замест 40 проц., у пэдтэхнікумы — 21,9 проц. замест 40 проц.

На пэдкурсы ў гэтым годзе недавербавана 500 чалавек. Калегія пастанавіла дабіцца поўнага укамплектаваньня пэдкурсаў. Перад ЦК ЛКСМБ ставіцца пытаньне аб мабілізацыі 200 камсамольцаў у пэдагагічныя ВНУ.

Паведамленьні

— ЦИК-НК РСІ Бел. паведамляе, што сёньня, 1 лістапада адбуўдзецца штодзённая вечарнім дзяжурствы членаў ЦКК КП(б)Б і адказных працаўнікоў ЦИК-НК РСІ для прыёму паведамленьняў па розных пытаньнях. Дзяжурствы адбываюцца ад 6 да 9 гадз. веч. у памяшк. НК РСІ (Савецкая, 55, 2-гі паверх, пак. № 1).

— 1-га сьнежня, у 6 гадз. веч., у памяшк. ЦК КП(б)Б, арганізуецца ЦК КП(б)Б склікае **нараду сакратароў вытворчых ячэек** г. Менску па пытаньні перабудовы ячэек на прадпрыемствах. Яўка ны партработы на прадпрыемствах. Яўка сакратароў вытворчых ячэек і загадчыкаў арг. аддз. Фрунз. і Кастрычн. РК КП(б)Б абавязкова.

СЕНЬНЯ:

—Кастрычн. РК КП(б)Б. У 19 гадз., у малай залі клюбу мэталістых (Унівэрсытэцкая, 19) — раённы дэлегацкі сход Кастрычніцкага раёну. Павінны дэлегаткі зав. «Ударнік», зьяніца дэлегаткі зав. «Энэргія», «Чырв. Зорка», сьпіртзаводу, вінчацін. ф-кі, лямп. ф-кі, «Чырв. Хімік», малочн. зав. і абутк. майст.

— Дом Асьветы. У 19 гадз. — пасяджэньне штабу вытворч. маноўраў. У нарадку дня — выніці агляду 5 школы. Запрашаюцца асьветнікі і рабочыя заводу «Бальшавік».

— Клюб навук. працаўнікоў. У 21 гадз. — пасяджэньне савету клюбу. Запраш. для пацьвярджэньня плянаў працы сэктараў т.т. Ноткін, Чарвакоў, Камінская, Паўлава, Вілежкін, Эльгольц, д. (Навукова-дасьледчы інстытут імя Леніна), дап. Страж (Беларуская с.-г. Акадэмія), т.т. Шчэрбка (Балотная станцыя), Сюбараў (Беларускае аддзяленьне Усесаюзнага Інстытуту прыкладной батанікі), праф. Тэрасевіч, т. Крайвіц, Найлус, Форштар (санітарна-гігіенічны інстытут), дап. Монасон (дыятычны дыспансэр), т.т. Дзвізевіч, Шырокаў (хлебная інспэкцыя), Гутковіч («Беларускі Батрак»), а таксама адказныя прадстаўнікі Наркамзэму, Наркамгандлю, Белкавсаюзу, ЦП саюзу нархаргі і особы, якія займаюцца пытаньнямі культываваньня соі ў БССР з адпаведнымі матар'ялямі.

Адказны рэдактар
С. БУДЗІНСКІ.

Рэдакцыя і галоўная контора Менск, Савецкая, 63.

ТЭЛЕФОНЫ:

Рэдактар	10-74	Начны рэдактар	6-42
Сакратар	6-19	Галоўная контора	7-81
Партсэктар	23-60	Аддзел падпіскі	7-81
Сэктар інфармацыі	15-80	„ абвестак	7-82

Умовы падпіскі
(з дармовым рэдаткам „Прафрух")

На 1 мес.	— 90 к.
„ 3 мес.	2 р. 80 к.
„ 6 мес.	5 р. —
„ 12 мес.	9 р. 75 к.

Плата за абвесткі:
За радок конп. пасьля тэксту—60 к., іншагародняя абвестка—4 р. за радок. Пасярэдзе тэксту—у два разы дарожэй. Пры шматкратным друкаваньні—скідка. Зьмена тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. бярэцца 10 проц. падатку.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „Зьвязда" Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

ЦСПСБ, рэдакцыі газэт „Зьвязда" і „Рабочай"
СКЛІКАЮЦЬ 26 ЛІСТАПАДА в 7-й гадз. увечары ў памяшканьні залі пасяджэньняў ЦСПСБ
НАРАДУ
старшынь фабзаўмясцкомаў, прадстаўнікоў шэфскіх арганізацый, рэдактароў шматтыражак, насьценгазэт і рабкораў „Зьвязды" і „Рабочага".
ПАРАДАК ДНЯ:
ЧАРГОВЫЯ ЗАДАЧЫ
справаздачна-перавыбарчай кампаніі саветаў
(даклад адк. сакратара цэнтральнай выбарчай камісіі т. МІКУЛІЧА).
ЦСПСБ
Рэдакцыя газ. «Зьвязда»
Рэд. газ. «Рабочай».

Фрунзаўскі РК КП(б)Б склікае 4 сьнежня ў 6 з пал. гадз. вечера у памяшканьні Дому Камасьветы
СХОД СТАРЫХ РАБОЧЫХ Фрунзаўскага раёну
з наступным парадкам дня: Чарговыя палітычна - гаспадарчыя задачы партыі. (Дакладч. т. Будзінскі).
Уваход па запрашальных білетах, разасланых па партколектывах прадпрыемстваў.

Кастрычніцкі РК КП(б)Б
ПАВЕДАМЛЯЕ, ШТО сёньня у 6 гадз. веч. у памяшканьні клюбу Леніна (пас. ванз.) адбудзецца
ПРАЦЯГ НАРАДЫ РАБКОРАЎ
На нараду павінны зьявіцца сакратары партколектываў, старшыні ФЗМК, піраўнікі прадпрыемстваў і установаў, рабкоры, старшыні рэдкалегій насьценгазэт і шматтыражак, сэктары друку, упаўнаважаныя на падпісы на газэты. Усе камсамольцы, якія павінны быць на нарадзе, вызначаюцца ад камсамольскіх сходаў.
ЯЎКА АБАВЯЗКОВА.
Сакратары вузлоў КП(б)Б павінны прасачыць за яўкай усіх таварышоў.

У чацьвер, 27-га лістапада а 7 гадз. увеч.
СЭКТАР САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА ЗЯМЛЯРОБСТВА „ЗЬВЯЗДЫ"
склікае ў памяшканьні рэдакцыі (Савецкая, 63, 3-ці паверх)
СПЭЦЫЯЛЬНУЮ НАРАДУ
ПА ПЫТАНЬНІ АБ СОІ.
На нараду запрашаюцца т.т. Гавін, Пратасеня, Драздоў, праф. Вінер, Эгельгардт, д. (Навукова-дасьледчы інстытут імя Леніна), дап. Страж (Беларуская с.-г. Акадэмія), т.т. Шчэрбка (Балотная станцыя), Сюбараў (Беларускае аддзяленьне Усесаюзнага Інстытуту прыкладной батанікі), праф. Тэрасевіч, т. Крайвіц, Найлус, Форштар (санітарна-гігіенічны інстытут), дап. Монасон (дыятычны дыспансэр), т.т. Дзвізевіч, Шырокаў (хлебная інспэкцыя), Гутковіч («Беларускі Батрак»), а таксама адказныя прадстаўнікі Наркамзэму, Наркамгандлю, Белкавсаюзу, ЦП саюзу нархаргі і особы, якія займаюцца пытаньнямі культываваньня соі ў БССР з адпаведнымі матар'ялямі.

Беларускі Другі Дзяржаўны Тэатр
„ГОРАД ВЯТРОЎ"
п'еса ў 5-ці дзеях, 12 абразох
Пастаноўка С. Розанова і М. Міцкевіча. Музыка Стораженскага. Мастак Ю. Гольц. Дырыжэр І. Гітгарц. Харм. ансамбль М. Кауфман. Дырыжэр-лябарант Куйін.
Пачатак а 8 гадз.
Серада, 26 лістапада для пралетэтуду
Чацьвер, 27 лістапада для саюзу саўгандальслужб.
Субота, 29 лістапада для саюзу будаўнікоў.

НЛЮБ імя КАРЛА МАРКСА
29 і 30 лістапада
2 вечары балету
прем'еры вялікага дзяржаўнага тэатру Саюзу ССР
народнай артысткі рэспублікі К. В. ГЭЛЬЦЭР
З удзелам: салістага вялікага тэатру Ул. Голубіна, вольнага мастака Я. Пінко (скрыпка), З. Кітаеў (піяніна).
Білеты прадаюцца штодзённа ў рабочай касе з 12 да 2 і з 4 да 6 г., у клюбе К. Маркса з 2 да 4 і з 6—8 г.
Пачатак роўна ў 8 з пал. гадз.

ЗОА-ВЫСТАУКА ЗВЯРЫНЕЦ
ДЗЯРЖЦЫРКУ Савецкая, 90, пор. Ленінскай
адкрыта штодзённа з 8 г. ран. да 11 г. увеч.
ПРЫБЫЛІ НОВЫЯ ЗЬВЯРЫ:
леў, леапард, гіена палосатая, гіена плямістая, ваўкі, мадальведзі, рысь, мурэўды, дзікавабразы, барсукі, алень, вярблюд, арлы, кракадзіл, 20 мала і шмат іншае зьвярыны.
Школам і экскурсіям—ільготная плата, скідка 40 проц.
Адміністрацыя.

Даводзіцца да ведама клієнтуры ашчадкас г. Менску,
ШТО УСЕ АБЛІГАЦЫІ
1-й і 2-й пазык індустрыялізацыі і пазыкі Узмацненьня сялянскай гаспадаркі,
якія знаходзяцца ў ашчадкасах на хаваньні і пад пазычнікі (ссудамі)
ПАВІННЫ БЫЦЬ АБМЕНЕНЫ
на пазыку „Пяцігодка—за 4 гады" да 10 сьнежня 1930 г.
У выпадку няўкі клієнтаў да паказанага тэрміну для абмену аблігацый, зноўнія будуць абменены звычайнымі.
Менская гар. ашчадкаса.

Група таварышоў, якія знаходзяцца ў г. Менску, выказвае глыбокі жаль з прычыны сьмерці актывістага-грамадзяніна, арганізатара калгасу імя Будзённага (Узаравіцкі раён)
ЛАРЫЁНАВА
ПЯТРА ПАУЛАВА

1-шае ў БССР Гукавое кіно „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"
2-я гукавая праграма „Алімпіяда мастацтваў"
Гукавы кіно-агляд у 4 частках
„ПОШТА" палішарж у 2-х частках.
Касе—ад 4 гадз. увеч. Пачатак сэансаў—6, 7 з пал., 9, 10 з пал. гадз.

Кіно-тэатр „Культура"
Новы мастацкі фільм вытворчасьці БЕЛДЗЯРЖКІНО
НЯНАВІСЬЦЬ
Эпапэя ў 8-мі актах
Пачатак дзен. сэансаў у 1 гадз. 12 г. 30 м., вечорнік—у 7 г., 8 г. 30 м. і 10 г. 23 м.

КІНО „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ"
ВАЙСКОВЫ ГІСТАРЫЧНЫ ФІЛЬМ
1-ая КОННАЯ
ЗВЫШ ПРАГРАМЫ
кіно-хроніка Белдзяржкіно № 2
Пачатак 1 с. а 6 г.
Касе—ад 4 гадз. 30 м.

КІНО „Пралетары"
Мастацкі фільм
КАЛАМУТА
драма ў 7 частках.
Пачатак 1 сэансу ў 6 г., 2-га—7 г. 30 м., 3-га—9 г., 4-га—10 г. 30 м.
Касе—ад 4 з пал. гадз. веч.

Кіно „ЮНЫ ПІЯНЭР"
Мастацкі фільм
Нявольнікі мора
ў 7 частках.
Пачатак 1-га сэансу ў 1 гадз., 2-га—2 г. 30 м.
— Касе—ад 12 гадз. дня —

КІНО „СпартаК"
2-я апошняя сэрыя
НІБЭЛУНГІ
(Помста Крымгільды).
Трагедыя ў 10 част.
Пачатак сэансу: 6 г. 30 м., 8 г. 30 м., 10 г. 30 м.
Касе вычынена з 12 г. дня.

ЗООТЭХНІЧНЫ ІНСТЫТУТ у Горках
абвяшчае
НАБОР АСЬПІРАНТАЎ
па наступных спэцыяльнасьцях
Кормазабываньні
Кармох і кармільні
Генэтыцы і разьвядзеньні буйной рагат. жывёлы.
Сьвінагадоўлі
Арганізацыі жывёлавод. калгасаў і саўгасаў.
Тэрмін падачы заяў—10 сьнежня 1930 г.
Да заявы патрэбны дакументы: жыцьцёпіс, аб скончаньні ВНУ, аб сацыяльным становішчы і паходжаньні, аб адносінах да вайсковай павіннасьці і водгукі аб працы.
ДЫРЭКЦЫЯ.

КАНЧАТКОВЫЯ ТЭРМІНЫ
перарэгістрацыі наборных кніжак МЦРК
на пунктах ЖАКТ'аў і пунктах раёнаў міліцыі
—наступныя:
У раёнах міліцыі №№ 1, 2, 3 і 4 канчатковы тэрмін—30 лістапада наступным парадкам: прозьвішчы, якія пачынаюцца з літар альфабэту М, Н, О, І—25 лістапада, Р, С, Т, У—26 лістапада, Ф, Х, Ц, Ч, Ш, Ю, Я, Э—27 лістапада.
Усе тыя, якія не пасьпеюць прайсьці ў гэты тэрмін, павінны прайсьці перарэгістрацыю ў тым-жа пункце міліцыі 28, 29 і 30 лістапада.
Канчатковы тэрмін прахаджэньня перарэгістрацыі па ЖАКТ'ах:

ЖАКТ № 1—26-XI,	ЖАКТ № 11—27-XI,
„ „ 2—24-XI,	„ „ 12—27-XI,
„ „ 3—25-XI,	„ „ 13—26-XI,
„ „ 4—16-XI,	„ „ 16—27-XI,
„ „ 5—28-XI,	„ „ 17—26-XI,
„ „ 6—27-XI,	„ „ 19—28-XI,
„ „ 7—27-XI,	„ „ 20—26-XI,
„ „ 8—26-XI,	„ „ 21—27-XI,
„ „ 9—25-XI,	„ „ 22—27-XI.
„ „ 10—27-XI,	

Праўленьне МЦРК.

Беларускі Другі Дзяржаўны Тэатр
абвяшчае
ПРЫЁМ У ТЭАТР
сталых супрацоўнікаў акторaў (мужчын).
Ад супрацоўніка вымагаецца адукацыя на ніжэй сярэдняй і веданьне вельмі, а таксама характарыстыка ад партыйных ці грамадзкіх арганізацый. Пры дасылцы толькі дакумэнтаў, заявочна тэатр нікога на прымае.
У першую чаргу прымаюцца сябры раб. драмгурткоў.
Кожны супрацоўнік будзе атрымліваць 80 руб. у к.-ц.
Адбор кандыдатаў па мастацкіх здольнасьцях будзе праводзіцца ў г. Менску 27-га лістапада а 4 гадз. дня ў памяшканьні Белдзяржтэатру.
Да іспытаў трэба абавязкова падрыхтаваць:
невялікі верш-шаў розна-характэрных і байку.

27 лістапада а 7 г. увечары
ЖБКТ «АСЬВЕТНІК-КАМУНАР»
у памяшканьні БАН (II паверх, заля) склікае
АГУЛЬНЫ СХОД ПАІШЧЫКАЎ.
ПАРАДАК ДНЯ:
1) Справаздача праўленьня.
2) Зацьвярджэньне праекту дому (дакл. БЖС).
3) Выбары праўленьня і рэвізіц. камісіі.
На сход павінны зьявіцца ўсе паішчыкі «Асьветнік Камунар», «Іскры» і б. Прапаўніка Асьветы.
ГАРЖЫЛСАЮЗ.

МЦРК паведамляе, што 27 лістапада ў 6 г. вечара ў памяшканьні клюбу харчавікоў імя Сталіна (пор Інтэрнацыянальнай і Камсамольскай) склікаецца
1 (8) ГАРАДЗКІ КААПЭРАЦЫЙНЫ ЗЬЕЗД ДЭЛЕГАТАЎ МЕНСКАГА МЦРК.
ПАРАДАК ДНЯ:
1) Даклад аб становішчы працы ЦРК і далейшых задачах. МЦРК.
2) Выбары праўленьня і рэвізійнай камісіі.
ПАСЯДЖЭНЬНЕ ФРАКЦЫІ зьезду склікаецца ў тым-жа клюбе 26 лістапада у 6 гадзін вечара.
На зьезд запрашаюцца члены камбюро, крамных, сталовых камісій, кааперагвізатары і прапаўнікі крам. Мандаты дэлегатам на зьезд выдаюцца ў арг. аддзеле МЦРК 25 і 26 лістапада (пак. 4, тэл. № 7-28).
Праўленьне МЦРК.

ВЯЧЭРНІ РАБФАК
абвяшчае
ЗІМОВЫ ПРЫЁМ СТУДЭНТАЎ
на ўсе курсы ня асьлынага, так і яўрэйскага аддзяленьняў.
Заявы будуць прымацца з 1 па 20 сьнежня. Іспыты—з 21 па 25 сьнежня. Залічэньні з 26 па 30 сьнежня. Прынятыя на 4-ы курс будуць ангажаваны ад працы на прадпрыемстве і забясьпечаны дзярж. стыпэндыяй. На рабфак прымаюцца рабочыя з 3-гадовым стажам, а таксама і дзеці рабочых, бацькі якіх маюць на менш 5 год стажу. Камандыруюцца праз прафсаюзныя арганізацыі.

ВІЦЕБСКІ індустрыяльна-пэдагагічны - інстытут
АБВЯШЧАЕ
ЗІМОВЫ ПРЫЕМ студэнтаў
на аддзяленьні:
1) Хэміка-тэхналёгічнае
а) Белсэкцыя—25 чалавек.
2) Фізыка-тэхнічнае
а) Белсэкцыя—25 чалавек.
б) Яўр. сэкцыя—25 чалавек.
Да іспытаў дапускаюцца: спончыўшыя рабфакі, тэхнікумы, 2-гадовыя агульна-адукацыйныя курсы, 9-годную пэдагагічныя курсы, ФЗВ і прафшколы на базе сямігодкі.
Заявы прымаюцца да 15-га сьнежня. Іспыты з 15 па 20 сьнежня.
Пачатак заняткаў 1-га студзеня 1931 г.
Дырэктар Інстытуту КАЛЯДА.

ШУКАЮ МЕСЦА
галоўнага БУХГАЛТАРА.
Маю салідны стаж вытворч. будаўн., с.-г. бухгальтарыі з акадэмічным ухілам.
Прапановы накіроўваць: Менская п.-т. кантора, да запатрабаваньня, прадпіяўніку чл. бір. № 9855.

ПАТРЭБНА вельмі
МАШЫНІСТКА,
якая добра ведае бел. мову. Зварачацца ў рэдакцыю газ. «ЗЬВЯЗДА» (Савецкая, 63, 3-ці паверх)

ХУТКА ВЫЙДЗЕ З ДРУКУ
№ 16
„ПАРТРАБОТНІК"
НУМАР ПРЫСЬВЕЧАН ПЕРАВЫБАРАМ САВЕТАЎ
ЗЬМЕСТ № 16
Супроць права-«лявацкага» блёку і яго прыхільнікаў.
Перавыборы саветаў.
Кераўнае—Пад знакам наступленьня сацыялізму па ўсім фронце.
Біх. Л.—Перавыбары саветаў і задачы агітацыйна-масавай работы.
Л. Лібізон—Задачы падрыхтоўкі працоўных жанчын да перавыбараў саветаў і выдзяленьня на кіруючую работу ў саветы.
Улазаў.—Партработа і кампанія перавыбараў